Ба 184

Ба 184

*„Загляне сонцэ
і ў нашэ ваконцэ“.*

Бел. аддзел
1994 г.

# ХАМ

(МУЖИК)

БССР
Бібліятэка імені Леніна

АБРАЗ

Э. ОЖЭШКО.

Изъ библіотеки С. К. Живописцева въ г. Орлѣ

Цэна 70 кап.

ПЕЦЯРБУРГ
1912.

# Выпіс с таварыскае умовы

## БЕЛАРУСКАЕ ВЫДАВЕЦКАЕ СУПОЛКІ

## „Загляне сонцэ і ў нашэ ваконцэ“.

(Адрэс: С.-Петербургъ, В. О. 6-я линія 1, кв. 20, издательство „ЗАГЛЯНЕ СОНЦЭ І Ў НАШЭ ВАКОНЦЭ“)

. . . .

Таварыства мае мэту друкаваць і шырыць выданьня беларускіе і ўсё, што стыкаецца з жыцьцём Беларусі.

Таварыства складаецца с паўнапраўных сябрукоў і супольнікаў.

Супольнікам можэ быць кожны, хто заплаціць у касу таварыства ня менш за дзесяць (10) руб. На гэтые грошы яму выдаецца супольніцкі квіт.

Кожны супольнік мае права купляць выданьня суполкі с скідкою 20%.

Супольнікі не мешаюцца да гаспадаркі таварыства (не вядуць рахункаў, не патпісываюць вэкселяў) і не атвечаюць за яго даўгі.

Кожны супольнік мае права падаваць голас дарадчы.

Ат чыстага спору (прыбытку) кожны год адлічаецца 15% у запасны капітал. З астаўшаеся часьці раздаецца усім сябруком і супольніком дывідэнд, але ня больш за 8% у год.

Кожны супольнік мае права выйсьці с таварыства і дастаць свае грошы назад, калі захочэць. Аб гэтым павінен ён на письме уведаміць за 6 месяцаў да канца года.

Хто хочэ, таму можэць быть выслана поўная таварыская умова.

---

**У выдавецтве „Загляне сонцэ і ў нашэ ваконцэ“ (С.-Петербургъ, В. О., 6-я л., № 1, кв. 20) можна купляць такіе выданьня:**

(Азначэнные зоркай — выданьня нашы, без зоркі — чужые, азначэнные *bis* — выйшлі і польскімі і рускімі літерамі).

### Выданьня беларускіе:

I. Да навучаньня:

| | | | |
|---|---|---|---|
| * bis | Беларускі лемэнтар | цэна 6 | кап. |
| * bis | Першае чытаньне Цётки | » 6 | » |
| * | Другое чытаньне Коласа | » 25 | » |
| | Karotki katechizm | » 5 | » |

II. Навуковые, даступные для усих:

| | | | |
|---|---|---|---|
| * | Гутаркі аб небі і зямлі з рыс. | цэна 15 | кап. |
| bis | Цукер В. Тройцы | » 3 | » |
| bis | Гутаркі аб гаспадарцы | » 3 | » |
| * bis | Як ратаваць уздутую жывёлу | » 3 | » |
| bis | Як бараніцца ад халеры | » 1 | » |
| bis | Як рабіць добрые рамовые вульлі | » 5 | » |
| bis | Зямельная справа у Новай Зэляндыі | » 3 | » |
| bis | Аб гаспадарцы на хутары і шнурох | » 5 | » |
| bis | Кароткая гісторъя Беларусі | » 60 | » |
| bis | Беларусы і іх нацыональнае адрадзеньне | » 5 | » |
| | Bł. Andrej Baboła mučynik | » 5 | » |
| bis | Як ужываць штучны навоз | » 2 | » |

15.04.2009

На арыгіналі напісана:

Къ представленію дозволено за № 11778,

С.-Петербургъ 26 октября 1911 года.

За цензора драматическихъ сочиненій

Ребровъ.

--------

Изъ библіотеки С. К. Живописцева въ г. Орлѣ

# ХАМ.

## АСОБЫ:

ПРОНКА РЫБЧИКОВА.

ПАЎЛЮК АКУНЬ - рыбак.

УЛЬЛЯНА - сестра Паўлюкова.

ПІЛІП КАЗЛЮК - муж Ульляны.

АЎДОЦЬЦЯ - матка Пілiпава.

ДАНІЛКА - малодшы сын Аўдоцьці.

АЛЯКСЕЙ МІКУЛА.

МАРЦЭЛЬКА - старчыха.

УРАДНІК.

ПАРАСКА - жонка Аляксея.

ЦЫПРУК - сын Пронкі, гадкоў са два.

Кабеты, парабкі, мужыкі, дзеўчаты.

Усё дзеецца ў вёсцы над Нёманам.

--------

## А К Т I.

/Сцэна прэдстаўляе: з леваго боку - бераг Нёмана; на узгорку відаць панскі палац в садам; каля самаго берагу чоўн, а ў ім сядзіць Паўлюк. Справа проці публікі - у глыбі сцэны - гара, заросшая лесам; дзе-недзе відаць крыжы і магілы. З верху ракі вадой нясецца гоман і чуваць, як нехта клічэ: "Па-а-ро-о-о-м, Па-а-а-ро-о-о-м." Паўлюк глядзіць у той бок, дзе панскі палац; справа мігацяць андаракі жанок, што ідуць па ваду з вёдрамі на каромыслах. Пяюць і сьмяюцца/.

Павей, вецер, павей, вецер,
    З зялёнаго гаю;
Ой, вярніся, мой міленькі,
    З далёкаго краю. -
Як я маю павевацi,
    Калі гай высокі.
Як я маю павертацi,
    Калі край далёкі.

/Паміж жанок Ульляна - маладая, здаровая кабета. Паўлюк мае пры сабе рыбалоўные снасьці: вуды, сеці і др. Гэта высокі, казісты мужчына, на галаве сівые валасы, але вочы поўные блеску, разумны лоб. Ужо пасьля заходу сонца. Здалёку чу -

ваць голас жалейкі, - відаць пастух; гонячы дамоў дабытак, ён іграе сабе аднастайную жалосную ноту/.

З'ЯВА І-ая.

ПАЎЛЮК - УЛЬЛЯНА.

УЛЬЛЯНА /адышоўшыся ад жанок, сьпеваючы падходзіць да Паўлюка/. Як маешся, Паўлюк.

ПАЎЛЮК /бытцам с прасонку/. Га!..

УЛЬЛЯНА. Вочы выглядаеш на бяду сваю...

ПАЎЛЮК. На якую бяду?.. Ніякой бяды не бачу...

УЛЬЛЯНА. Мне-ж гэта ўсё роўна... але, глядзі, Паўлюк, людзкіе языкі ужо разнясьлі, што дзень у дзень сходзіцеся вы тут, што возіш яе у чоўні, ды ўсё другое, а яна заўзялася на цябе...

ПАЎЛЮК. Заўзялася?.. Калі разнясьлі, то хай сабе разносюць, на тое-ж і языкі... Німа што гукаць пустое... шкадаваць трэ ўсіх - найменшаго, кожную кузюльку... душу шкадаваць і ратаваць яе ад згубы.

УЛЬЛЯНА. Мудра, разумна кажэш. Старшы ты за мяне і больш бачыў свету, чым я... Я гэта толькі з добраго сэрца. /Паднімае вёдры, каторые перш была паставіла і моўчкі адходзіць/.

ПАЎЛЮК /гледзячы ўсьлед ей/. Ульляна!..

УЛЬЛЯНА /прыстануўшы/. А што?..

ПАЎЛЮК /змагаецца з сабой, бытцам нешта хацеў сказаці; - пасьля, махнуўшы рукой, ціха кажэ/. Вось, сірата!.. бацькоў шэльмаў мела - душу на загубу аддалі, але жаль, чуеш, жаль... сірата...

УЛЬЛЯНА. Сірата, то сірата, але худые чуткі ідуць аб ей: кажуць, не аднаго палюбоўніцай была, не адны куты выцірала, ведама - панская служанка...

ПАЎЛЮК. Валачашчае жыцьцё, дрэннае жыцьцё - гэта бяздольле, і дзеля гэтаго тым болей трэба жалець.

УЛЬЛЯНА. Бог с табой, Паўлюк, свой розум маеш... я гэта толькі з сэрца... /Адходзіць/.

ПАЎЛЮК /ківае галавой, задумываецца і глядзіць у старану двара. С паміж дрэў на магільніку выходзіць старчыха Марцэлька, згорбленая; прыкоркнула на камені і пяе, заводзячы: "Павей, вецер, павей, вецер..." Паўлюк слухае. Раптам радасна устае, бо убачыў Пранусю, каторая бегла з горы/.

З Я В А 2-ая.

ПАЎЛЮК - ПРОНКА.

ПРОНКА /бяжыць с палацу; дробненькая, чорная,

вялікіе запаўшые вочы. Адзета у крамніну, па мястоваму; сукенка ў нізу абліта і забруджэна; пёстрые устужкі, у вушах тандэтные завушніцы, на шыі каралі, на галаве жоўтая шоўковая хустачка. С-пад хустачкі, каторая потым спадае на плечы, відаць наплутаные валасы. Прыбегшы да Паўлюка, падае на калені каля чоўна і выцягівае да яго рукі, цяжка дыхаючы/.

ПАЎЛЮК /устае здзіваваны, але рады/. А-а... прыйшла. ізноў прыйшла...

ПРОНКА /хапаючы яго за рукі/. Ой, міленькі, бяда на мяне зваліласе, такая бяда, што ўжо ня ведаю, ці вытрываю. Бегла і думала сабе, што хіба толькі ты мяне выратуеш, бо калі цяпер не прападу ужо саўсім, то нехай зямля пада мной зараз разступіцца.

ПАЎЛЮК. А якая-ж гэта бяда? кажы! /Гладзіць нясьмела яе па галаве/.

ПРОНКА /галосючы/. Кожны мае кагось такога, да каго у бядзе і нешчасьці прыхінуцца можэ. Адно мяне сірату безпрытульную Бог на сьвет пусьціў. Гэта-ж і ты сам казаў, калі першы раз вазіў мяне па гэтай вадзе: "Бедная ты, бедная, з усіх людзей найбяднейшая. Балачашчае жыцьцё тваё сіратлівае, благое і грэшнае, хай Бог крые"! До-

бра і лёгка гэтак казаць, маючы хату сваю, і добрые заработкі. Гэта зусім што іншае, чым усё жыцьцё са службы на службу цягацца, чужые куты выціраць, людзкую злосьць цярпець.

ПАЎЛЮК. Але-ж якая бяда, якая новая бяда табе трапілася?..

ПРОНКА. Паны, што меліся за месяц выехаць, заўтра выежджаюць. А я з імі не хачу - прападу, а не паеду... Мне толькі цяпер тут небо разчынілося, як бытцам у сне якім шчасьце пакавалося. Не разстануся я с табой, галубе мой, брацітка мой найдаражэйшы, баценька! /Цалуе рукі Паўлюковы; ён злёгка бароніцца, парушэны. Ізноў чуваць кліч: "Па-ро-о-м!" Гоман справа, відаць жанок, што нясуць ваду/.

ПАЎЛЮК /аглянуўшыся/. Вун тудой па ваду ходзяць, убачуць цябе, і хто ведае, што гаварыць пачнуць; хадзём у гушчар!.. /Адходзяць у бок, пры чым Паўлюк прыкмеціў каралі на шыі Пронкі/. А гэта што?.. а гэта скуль ты ўзяла?.. кажы, ды хутко - чуеш? кажы! /Трасе яе сярдзіта. Марцэля, сьмяючыся, хаваецца ў гушчар/.

ПРОНКА /сьмяючыся/. Дурны, дурны! Табе ў галаве дзівы здаюцца... Але гэта ня тое, што ты думаеш!.. ніхто іх мне не даў, і не купляла я.

ПАЎЛЮК. То скуль узяла? Кажы!..

ПРОНКА. Гэта маей пані каралі, але яны мне так да спадобы, што здзержаць не магла і ўзяла. Гэта ўжо ня першы раз - я заўсягды іх надзевала, калі паня выходзіла, а мяне запрашывалі у якую кампанію.

ПАЎЛЮК /востра/. Дрэнна ты зрабіла...

ПРОНКА. Вот! Я-ж не украла, ані аткусіла;прыйду дамоў і палажу на мейсцы дык знаку ня будзе, што брала я.

ПАЎЛЮК. То што... Але-ж гэта чужое. Я-б не паважыўся чужое крануць.

ПРОНКА /убачыўшы крыжы на магілі/. Ох-ей! Гэта-ж тут магільнік!

ПАЎЛЮК. Дык што, што магільнік? Грэху бойся, а не магільніку.

ПРОНКА. Грэху!.. Добра вам казаць - грэху. Каб-жэ было да каго прыхінуцца, на каго аперціся /кідае гарачы пагляд на Паўлюка/, то мо' і патрапіла-б, але я сама не змагу... благое цягне... цягне...

ПАЎЛЮК /бытцам сам сабе/. Не хачу, не пушчу. Далі Бог, не пушчу! /Страшэння парушэны, голасна/. Ізноў на бяздольле і здзек пойдзеш... І цела, і душы тваей не дам!.. Годзі ты ўжо набадзя-

лася!

ПРОНКА /падскочыўшы, абыймае і вешаецца на яго шыі/. А мой-жэ ты міленькі, мой даражэнькі! Каб сто перашкод паміж намі стануло, праз лясы і горы пабегла-б да цябе... А ўсё таму, што ты гэтак шкадуеш мяне. Ніхто і ніколі не пашкадаваў мяне, усе здзекаваліся нада мной. Матка і тая пакінула мяне, а пакуль і была, то чаго я навучылася пры ей... Раз спусты і толькі!.. А найбольш глуміліся тые, што бытцам-то любілі, а ты не глуміўся нада мной, ніколі нічога не жадаў... як бацька родны адносіўся.

ПАЎЛЮК. Нехай мяне Бог сьцеражэ ад гэтаго грэху, каб я з гэтай думкай вазіў цябе па рацэ... Душу тваю палюбіў і ратаваць яе хачу... Ганьбы тваей, сораму твайго і жыцьця благога твайго стыдаўся, як свайго... вось што!

ПРОНКА. Ведаю я, ведаю, што ты інакшы, чым другіе, чым усе тые злыдні, што бытцам любяць, а па праўдзі на глум выстаўляюць; і дзеля гэтаго я сама далей ісьці у сьвет не хачу, Да ног тваіх прыпаўзла, як сабака, і не пайду ужо.

ПАЎЛЮК. Супакойся, дзіцятка! /Садзіць яе на узгорку і схіляецца над ей/. Супакойся, сцішся!.. глянь на гэта неба яснае, паслухай, як вада пяе, толепей табе будзе... Можэ і твая душа будзе, так

як і мая, палюбіць гэтае высокае неба і гэтае ціхае сьпеваньне нашага роднага Нёману... Ціха, ціха, ціха!..

ПРОНКА /цалуе яго рукі і плачэ/. Лёгка быць добрым, жывучы гэтак з зямлей і небам, тут сярод лясоў і палёў зялёных, але папробуй там, у горадзі. /Прыхліпываючы/. Каб яны скрось зямлі пайшлі, каб на іх звод прыйшоў на гарады тые, паноў і маю службу сабачую.

ПАЎЛЮК. Гэта праўда, што твая служба - гэта астатняя служба!.. Але не кляні! Чый хлеб ясі, таго і шануй. Ну супакойся, супакойся!.. /Памаўчаўшы/. Ну то хіба павенчаемося. Што... Таварашам табе да сьмерці буду і ніколі не пакрыўджу. Будзеш меці куток свой, хлеба кусок і жыцьцё справядлівае. Ну, што, Пронка?..

ПРОНКА /зрываецца і кідаецца яму ў ногі; ня то са сьмехам, ня то с плачэм; ён яе падымае/.

ПАЎЛЮК. Ніколі мяне да ніводнай жанкі не цягнула, як да цябе. З жонкай нябошчыцай у згодзі жылі, але каханьня ніякаго не было, дый жыла яна ня доўга. А што ўжо пасьля раілі, то да ніводнай ахвота не брала. Ажно неўспадзеўкі, як першы раз у чоўні вазіў, а ты мне расказала пра жыцьцё сваё грэшнае, ўлезла ў галаву мне думка, каб выратаваць

Из библиотеки С. К. Живоцкого в Орле

цябе. Пронка! павенчаемся!.. Толькі куды ты падзенешся, пакуль шлюб возьмем?

ПРОНКА. Як то куды? Вось ўраз пабягу атказу службу і за момэнт тут буду.

ПАЎЛЮК. Тут будзеш.Але гдзе падзенешся?

ПРОНКА. А ў цябе! У тваей хаці...

ПАЎЛЮК. Дзіцятка! Беднае ты дзіцятка!.. Як жэ у маей хаці жыць будзеш, калі мы перад людзьмі ня муж, ня жонка. Вочы бы табе выгрызлі, і справедліва...

ПРОНКА. Чаму? За што?

ПАЎЛЮК. Бо грах! Пойдзеш да сястры маей Ульляны - там прабудзеш, пакуль заповедзі выйдуць. Вось ўраз пайду да яе і папрашу, а ты схадзі да паноў службу атказаць... /Пронка кідаецца яму на шыю,пасьля бяжыць у двор. Ён ідзе да чоўна. Пронка налетае на Піліпа Казлюка, каторы ідзе ад пораму з сецямі; за ім паказваецца Данілка, меньшы яго брат, І6-ці гадовы хлопец, з жэрдзямі і вудамі, абодва глядзяць на Пронку, куды яна бяжыць. Паўлюк падходзіць да іх. Ульляна выходзіць с праваго боку з вёдрамі і сьпевае/.

З'ЯВА 3-ая.

ПАЎЛЮК - ПІЛІП - УЛЬЛЯНА - ДАНІЛКА.

ПАЎЛЮК. Слава Хрысту Богу!

ПІЛІП і ДАНІЛКА. На векі вечные!

ПАЎЛЮК /звертаючыся да Ульляны/. А і ты, Ульляна, ізноў тут! дужэ добра. Згадала ты тое, аб чым я гаварыць буду?.. Воля Божая!.. ніхто ад яе не ўцячэ: худая, ці добрая - ўсё роўна.

УЛЬЛЯНА. Мудра гаворыце, але, відаць, аб гэтай дзеўцы хацеў казаць...

ПАЎЛЮК. Але-ж, маю да вас просьбу і прашу вельмі, каб вы ласкава прынялі маю гутарку і зрабілі так, як скажу.

ПІЛІП. А чаго-ж хочэце?

ДАНІЛКА /седзючы ў лодцы, майструе у ёй/.

УЛЬЛЯНА /бяручыся ў бакі/. Ну, дык слухаем...

ПАЎЛЮК. Ці я табе, Ульляна, калі нашы бацькі памёрлі і цябе маленькую на маіх руках пакінулі, благім быў братам?

УЛЬЛЯНА. Божэчка! А хто-ж гэта кажэ?..

ПАЎЛЮК. Ніхто не кажэ, але я сам вам сказаці хацеў, што ўсё, што мог для вас зрабіць, зрабіў. Калі ты замуж шла, тры часьці гароду свайго аддаў вам, даў вам карову, дзесяць авечак купіў. Ці я

праўду кажу.

ПІЛІП. Праўду; а хто-ж гэта кажэ, што не праўду?.. Але і мы для цябе благімі не былі.

ПАЎЛЮК. Не былі і дзеля гэтаго да вас і да вашай жычлівасьці з інтэрэсам звертаюся...

УЛЬЛЯНА. Божухна! А не казала?. І то пэўна з гэтай...

ПАЎЛЮК. Так - с Пронкай; ей патрэбен апекун і прыяцель... і абецаўся.

УЛЬЛЯНА /ламаючы рукі/. А казала!.. вось і беда!.. Ці-ж гэта для цябе жонка? Не малады ты ўжо не дзяцюк!.. Падумай, Паўлюк, на што табе беда гэта?..

ПІЛІП. Ці вы толькі добра робіце, што с такой жаніцца здумалі? Гэта-ж, ведама, ад дзіцяці па дварох цягалася, лякайская палюбоўніца - вось і ўсё. Ой, глядзіце, каб бяды не набрацца!..

УЛЬЛЯНА. Ты-ж наш брат, а тая нема ведама хто, ды яшчэ з гораду - да другога жыцьця прывыкшы...

ПАЎЛЮК. Ня бойся! Пашануе мяне і прысягне. А што да таго, якою была,- то німа што. Я палюбіў яе і хачу выратаваць. Загубіла душу, бо ніякой апекіня мела. Тые, што любілі,- глуміліся, а я не такі. Прашу вас, каб вы яе на тры тыдні узялі ў сваю хату, пакуль да венца. Сірата яна і не мае, дзе прытуліцца.

УЛЬЛЯНА /пацягіваючы носам/. Пэўна, калі сірата, то бедная; усё-ж ткі, што бадзяка, то бадзяка... але калі хочэце...

ПІЛІП. Прыймем, чаму ня прыймем. Ці хлеба ня хопіць, ці хата цесна?.. Ня лічылі мы ніколі на вашэ дабро і абыдземся без яго!.. Вялікая рэч, што пасядзіць сабе у нас...

УЛЬЛЯНА. Мы для цябе ўсё зрабіць гатовы, каб тольькі табе добра было!.. А ткі боязна!. /Бярэ вёдры і ідзе, а за ею Піліп і Данілка. Паўлюк садовіцца у чоўні/.

УЛЬЛЯНА /ідучы, да мужа/. Піліп!

ПІЛІП. А што?

УЛЬЛЯНА. А Паўлюк дык саўсім адмяніўся: здаецца, памаладзеў. Каб тольькі ён бяды не напытаў сабе!

ДАНІЛКА /піскліва/. Здаецца да неба галавой торкнуўся, такі шчасьлівы. /Хаваецца паміж дрэў/.

З Я В А 4-ая.

ПРОНКА - ПАЎЛЮК - МАРЦЭЛЬКА.

/З лесу высоўваецца Марцэлька, падпіраючыся кійком. Гэта старчыха с чырвонымі вачыма, заплыўшымі сьлязьмі, каторые яна выцірае рукавом. Глядзіць у след Піліпу і Ульляне, каторые яе не бачаць; Марцэлька злосна рагочэ. У той жэ час паказываецца Пронка з

леваго боку, засопшыся, с клункам у руках/.

ПРОНКА /абыймаючы Паўлюка за ногі/. Мой ты даражэнькі, мой ты залаценькі, я пры табе, і ўжо назаўсягды!.. Маеш, глянь, як сэрцэ бьецца!..

ПАЎЛЮК /узіраецца, ці тые ўжо пайшлі/. А ці сказала ты панам, што замуж ідзеш?.. /Паўлюк гаворыць памалу/.

ПРОНКА /сьмяючыся/. Кабы не так! Ці сказала?.. А паня сказала, што я раблю мэзаліанс.

ПАЎЛЮК. А гэта што такое?

ПРОНКА. Паны так заўсёды кажуць, калі чэлавек вышэйшаго роду жэніцца з ніжэйшай і надварот. Паня казала: "Пронка дурная, што за мужыка ідзе, такая дэлікатная дзяўчина, да гораду і выгад прывыкшая". /Апёршы галаву на руках, ціха/. Мне гэта і самой у галаву прыходзіло. Мужыкоў я ніколі не знала і с хамамі не жыла. Сваякі мае, мая радня, як даведаюцца, то адракуцца саўсім ад мяне. Мой дзед меў два дамы, бацька у канцэлярыі служыў, а матка і на фартэпіяні іграла... Божухна, мой Божэнька! У дамоўцы бедная пераверпецца...

ПАЎЛЮК /махаючы рукой/. Пустое!.. Паны пустое гаворацъ, а ты за імі. Якая там твая вышэйшасьць?. С хамамі ты не жыла, то праўда, але с кім ты жыла! С шэльмамі жыла. І сама за імі брыла ў гразь, ды

балота. З іншым жыцьцём табе іншы розум прыйдзе...

ПРОНКА. Як жыву, першы раз такога чэлавека бачу... Ці ты які перэадзеты ксёндз, ці што?.. Ажно дзіва!.. /Хвіліну маўчаць/.

ПАЎЛЮК. Але ты, Пронка, апомнішся?.. Направішся? Будзеш жыць, як Бог і людзі казалі?..

ПРОНКА. Буду, буду!..

ПАЎЛЮК. Злажы пальцы на крыж і перад гэтым крыжом /цягне яе на ўзгорак да магілкі/ прысягні, што блаж пакінеш, чорту прыступу да сябе не дасі...прысягні!..

ПРОНКА /адвярнуўшыся да крыжа са зложэнымі пальцамі, пасьпешна гаворыць/. Каб мне так Бог памагаў, каб я па сьмерці Бога так бачыла, каб чорт душы маей так не хацеў, як я буду цябе вечна, аж да самай сьмерці любіць і шанаваць, мой ты галубок міленькі, залаценькі, брылянтовы!..

МАРЦЭЛЬКА /скрытая ад іх, але з боку сярод сцэны на фронці відочная, рагочэ: "Хі-хі-хі!.." /Паўлюк і Пронка спуджэные агледаюцца, але Марцэлька ўжо схавалася/.

Завеса.

БССР Дзяржаўная бібліятэка імені Леніна

## А К Т II.

/Сцэна прэдстаўляе хату Паўлюка. На левым баку вялікае ложка, высока пасланое, а на ім уся ў пярыні ляжыць Пронка; на право ў куце чырвоная альховая шафа - на ей лямпа з высокім шклом, невялічкі блішчачы сымыварчык, набожная кніжка, напханая сьвятымі абразкамі; печ, лава, сталы, два вёдры з вадой. У печы гаршчкі, ў каторых варыцца страва; у куце с права кросны і калаўрот; проста, у глыбі сцэны і на лева - дзьверы/.

### З ' Я В А I-ая.

УЛЬЛЯНА - ПРОНКА - МАРЦЭЛЬКА.

УЛЬЛЯНА /глянула праз вакно у хату, плюнула і пайшла сабе. Праз хвіліну з'яўляецца Марцэлька/.

МАРЦЭЛЬКА /ціха атчыняе дзьверы у глыбі сцэны і кашляе/.

ПРОНКА /разбудзіўшыся і пацягаючыся, глядзіць у старану дзьвярэй/. А-а!..

МАРЦЭЛЬКА. А! так вы яшчэ сьпіцё. А ўжо і падвячорак на сьвеці, мая-ж ты міленькая! Людзі даўно ужо папалуднавалі і канчаюць у полі работу /падходзіць да печы/. О! Агонь разложэны. Варыцца страва. /Паўзіраўшыся/. У хаці прыбрано!.. А хто-ж гэта вам

вады прынёс, гаршчкі паўстаўляў у печ?.. /Глядзіць ласа у гаршчкі/.

ПРОНКА /седзючы у пасьцелі і лянiва разглядаючы свае ногі/. Муж паехаў сёнека з рыбай у горад, а прад выездам прынёс вады, разлажыў агонь і паўстаўляў гаршчкі са страваю у печ. /Злазіць з ложка, - усунула ногі у плоскіе чэравікі; пазевывае, апранае андарак і памаленьку яго завязывае, ўвесь час пацягіваючыся/.

МАРЦЭЛЬКА /падышоўшы к ей/. А добры ён чэлавек! Але-ж ты, мая міленькая, пекная, то пекная; ня дзіва, што твой сьвету за табой не бачыць /агледае яе/! Божэнька мой. Ножкі ў цябе бялейшые, як твар у другой, а вочкі, як пацерачкі, бліскучые... Міленькая мая!.. а сала дасі?.. Прыйшла я, як да родненькай... /Ізноў агледае яе/. А-а! у поясі якая ценькая!..Як тая канапелька!.. як якая паненка, сьціснутая гарсэтам!..

ПРОНКА. А ці бачыла ты калі гарсэт?

МАРЦЭЛЬКА. Ці я бачыла гарсэт? - Божэнька мой! Чаго я на сьвеці не бачыла?..

ПРОНКА. Ведаеш што, Марцэлька? Пастаў самаварчык - выпьем гарбаты; мой абецаўся прывязьці цукеркаў... Страшэньне мне бяз іх маркотна.../Ізноў пацягіваецца/.

МАРЦЭЛЬКА /закраталася і настаўляе самавар. Хвіліну маўчаць/. Ой і я шмат пекнасьці і багацьця бачыла!.. Усю сваю моладасьць праслужыла па дварох, а пасьля... вось ужо 15 гадоў па сьвеці цягаюся, як старчыха, што жыве з ласкі такіх, як ты, міленькая! Мужычка я - праўда, але яшчэ малой дзяўчынкай да двара мяне забралі, - тамака я наелася хлеба... і бяды.

ПРОНКА /пазіраючы ад часу да часу у люстэрка, што вісіць каля вакна, чэшэ галаву/.

МАРЦЭЛЬКА /выймае з шафы зялёные шклянкі, лыжачкі, цукер у мяшэчку і ставіць на вакно, усё апаведаючы/. Таму-ж то я адразу і спазнала, хто ты; іншые, мусіць, не спазналі, а я спазнала.

ПРОНКА. А хто-ж я?

МАРЦЭЛЬКА. Паненка! Ой, ты паненка і дэлікатная і пекная, як каралеўна!.. Калі ён цябе браў, я падумала сабе... ось! Божэнька мой, мужык такі просты, а захацелося яму каралеўны. Для мяне дзіўна, што ты пайшла за такога простаго мужыка.

ПРОНКА. Я і сама ня ведаю, як гэта сталося. Сама я ніколі не спадзевалася выйсьці за мужыка. Я-ж з добрай сямьі: дзядзька мой аж два дамы меў, бацька служыў у канцэлярыі, а стрыечны брат аблакатам у вялікім горадзі - і багаты, багаты!.. Вось, да чаго

прыйшло... Я зрабілася мужычкай і /плачучы/ пры жыцьцю зыйшла ў магілу. Ужо для мяне німашака іншаго жыцьця, як мужыцкае.

МАРЦЭЛЬКА /пацешаючы яе/. Ну!.. годзі!.. не плач!.. калі муж добры і мілы, то ня згінеш!.. Ці мілы. /Нагінаецца і сьмяючыся шэпчэ ей нешта на вуха/.

ПРОНКА /сьмяючыся і адвертаючыся/. Ой! ой!.. Што да гэтаго, то здаецца, бытцам яму і двадцаці гадоў німа яшчэ!.. /Кажэ нешта Марцэльцы на вуха і абедзьве пачынаюць рагатаць/.

МАРЦЭЛЬКА. Ці-ж ты не варта каханьня!.. Каралеўна! Чыста каралеўна!.. Калі нават жонка Аляксея, хоць і найпрыгажэйшая з усей вёскі, пры табе як калода...

ПРОНКА. Ці-ж яна прыгожая? Ён, гэта так!..найпрыгажэйшы з усіх мужчын!.. вочы, як васількі, а зубы, калі засьмяецца, бытцам с цукру...

МАРЦЭЛЬКА. Можэ-б гэтай салодасьці пакаштаваць?..

ПРОНКА /сьмяючыся/. Можэ-б...

МАРЦЭЛЬКА. Ой! калі ён страшэньне любіцца з сваей жонкай, а на іншых і не глядзіць...

ПРОНКА. На іншых - можэ, але на мяне!.. Каб толькі захацела, - мой будзе!.. /Пье гарбату;хві-

ліну маўчаць/. О! нешта грызе мяне ў сярэдзіне, і так на сэрцы ня добра! І якжэ-ж мае быць добра? Каб і німа ведама які, а ўсёж-ткі мужык!.. /задумалася/ і... стары - так!.. стары! /Закладае рукі над галавой і сядзіць гэтак/.

МАРЦЭЛЬКА /цішком забірае цукер і хавае у торбу/.

З'ЯВА 2-ая.

ПРОНКА - УЛЬЛЯНА - МАРЦЭЛЬКА.

УЛЬЛЯНА /уходзіць дзьвярыма у глыбі сцэны і, стануўшы на парозі, кажэ/. Устала?.. А я ўжо сюды заглядала два разы... Можэ-б ты ўзялася за работу, Пронка? Маю хвіліну часу... на калаўроці пакажу... хочэш?..

ПРОНКА /ляніва/. Цяжка!

УЛЬЛЯНА /ідучы да калаўрота/. Прывыкнеш!..

ПРОНКА /памалу ідзе і станавіцца ля калаўрота/.

УЛЬЛЯНА /пачынае прыгатаўляць яго і паказывае/.

ПРОНКА. Не хачу! не хачу!- рукі і ногі баляць. На якое ліха мне прыпатрэбіцца ўмець прасьці? Досі ўжо я напрацавалася, нагаравалася с канешнай патрэбы, а цяпер, калі яе німа, то хай ужо чорт сілы надрывае - я ня буду. /Плюе са злосьцю/.

МАРЦЭЛЬКА /ціха стаіць у куце/.

УЛЬЛЯНА /выходзячы/. А як сабе хочэш! /Ад парогу/. А добра-б было, каб вы пайшлі падаіць кароў. Ці-ж табе ня сорам, што твой сам кароў доіць? гэта-ж не мужчынская, а жаноцкая работа!

ПРОНКА. А табе што? Ня сунь свайго носа туды, гдзе цябе ня просяць. Я вашых хамскіх работ не рабіла і рабіць ня буду!.. бывайце здаровы!

УЛЬЛЯНА. А ты хамамі не лайся! Якое ты маеш права лаяцца хамамі, калі ты сама была чорт ведае чым?.. Нам, простым людзям, сорам за цябе, а мужыцкай сермягі мы не саромяемся. Хай саромяюцца тые, што нічога ня робяць, а гультуюць...

МАРЦЭЛЬКА /цягне с паліцы у торбу сала і ціхенька выходзіць с хаты, злосна рагочучы/.

ПРОНКА /кідаецца с кулакамі на Ульляну/. А!.. праклятые мужыкі!..

З ' Я В А 3-ая.

ПАЎЛЮК - УЛЬЛЯНА - ПРОНКА.

ПАЎЛЮК /уходзіць с торбай і глядзіць здзіўлены на жанок/. А гэта што?.. што з вамі?..

УЛЬЛЯНА. Пронка ня хочэ прасьці, ды яшчэ лаецца.

ПРОНКА. Гэта яна губы распусьціла.

ПАЎЛЮК. Ціха! ціха! /Звертаючыся да Ульляны/.

Калі ня хочэ, то хай не прадзе.

УЛЬЛЯНА. Эй, Паўлюк, нешта ты жонцы за шмат панаваць пазваляеш!.. Глядзі, каб з гэтаго панства бяды якой ня выйшло!

ПАЎЛЮК. Не бядуй, Ульляна...

ПРОНКА /зачыняецца ў каморцы/.

ПАЎЛЮК. Я ведаю, што раблю!.. Я яе вырваў з мук не для таго, каб яна ізноў мела муку, але каб ей добра было жыць на сьвеці, бо калі чэлавеку дрэнна, дык ён і сам благі, а калі добра, і ён добры.

УЛЬЛЯНА. Эй, Паўлюк... Скуль ты яе ўзяў... Ці ты яе ўзяў ад бацькоў з роднай хаты? Якой яна была, калі ты яе браў?.. Людзям губы не завяжэш!.. Сьцеражы, каб якое ліха не прычапілася да яе... Валакіта!.. патаскуха!..

ПАЎЛЮК. Чаго, чаго, а гэтаго пэўне ня будзе: яна-ж прысягнула...

МАРЦЭЛЬКА /мігаючы у вакне, кажэ па-ціхоньку, сьмяючыся/. Ой, дурны, ой, дурны!..

УЛЬЛЯНА /махнуўшы рукой/. Ой! што табе з гэтаго дабра ня будзе, то ня будзе!.. /Пайшла/.

З ' Я В А 4-ая.

ПРОНКА - ПАЎЛЮК.

ПАЎЛЮК /падходзячы да каморы/. Прануся!.. Пронка!

Нешта дам табе! Я прывёз цукеркаў.

ПРОНКА /са злосьцю/. Маю я ад тваіх цукеркі..

ПАЎЛЮК. Ціха! Годзі, дзіцятко, годзі!

ПРОНКА /выходзіць, нясучы мужыцкую апратку і кідае яе на ложка/.

ПАЎЛЮК /выймае цукеркі с торбы і ў паперцы падае Пронцы/. На, маеш! Прасіла - я і прывёз.

ПРОНКА /кідаючыся да іх/. Ах! якіе смашные! Даўно-ж я іх ня ела. /Есьць і пачынае апранацца/.

ПАЎЛЮК /выймае с торбы іншые рэчы/. А вось прывёз для Аляксея і Івана цьвякі і шнуркі, а для іх кабет пацеркі і хусткі... глядзі, ўраз мусіць і прыйдуць.

ПРОНКА /апранаючыся/. Вось я і мужычка!.. родны бацька не пазнаў-бы мяне, а матка, каб глянула на мяне з магілы, ў дамавіні на другі бок перэвярнулася-б. Вось, ужо і па мне! Закапалі мяне на вёсцы і німа мне іншаго жыцьця, як мужыцкае.

ПАЎЛЮК. Маеш табе! ізноў дур прыстала!.. Дзіця!

ПРОНКА /сеўшы, плачэ/.

ПАЎЛЮК. Табе наклалі глупств у галаву, а ты і паўтараеш. Як паходзіш даўжэй у гэтай вопратцы, прывыкніш. Ну, ціха, Пранcréation! Німа чаго!.. /Выціраe ей вочы і гладзіць па галаве/.

З'ЯВА 5-ая.

/Гоман за дзъвярыма - уходзяць А ў д о ц ь ц я, А л я к с е й і др./.

АЎДОЦЬЦЯ - АЛЯКСЕЙ - ПРОНКА - ПАЎЛЮК.

ПРОНКА /выцірае хвартухом услончыкі і падае іх. Аўдоцьцю цалуе у плячо, вітаецца з другімі, Аляксею кідае жартуючы горсьць цукеркаў і праз увесь час залецаецца да яго/.

АЎДОЦЬЦЯ /падышоўшы да Паўлюка/. А што, кумок, ці добра табе цяперака?.. рад, што ажаніўся? а?..

ПАЎЛЮК. О, добра! І як добра! Чаго хацеў, таго і дастаў. Чаму не мае быць добра?

АЎДОЦЬЦЯ. Я сватала іншых, а ты ўсё... не, ды не! Ці ты хацеў такую, як яна?

ПАЎЛЮК. Хто яго ведае? Я сам ня ведаў, якую хацеў.

АЎДОЦЬЦЯ /ківаючы галавой/. Глядзі-ж толькі, каб ня выйшло што благое!.. /Глядзіць на Пронку, катора залецаецца да Аляксея/. Уселякіх я на сьвеці бачыла і ведаю адно, што ваўка цягне ў лес, а вашу цягне да кепства... Старые вочы шмат чаго бачылі... Глядзі, Паўлюк!..

ПАЎЛЮК /сумневаючыся/. Прысягала і стрымае.

Бяз Бога да гэтуль жыла і чорт да яе прыстаў, а цяперака ходзіць... У сьвятой кніжцы пішэцца,што Сіон палюбіў Прачыстаю Дзеву. Можэ і яна палюбіць, а Дзева абароніць ад злога...

АЎДОЦЬЦЯ /круцячы галавой/. Усё-ж такі добра, што рад, што здаволены, адно толькі дрэнна, што шчасьце гэта птушка крылатая,а як ей абарвеш скрыдлы, то і па ўсім!.. На волю пусьціць - дрэнна, а ня пусціш - памрэ.

ПРОНКА /да Аўдоцьці/. Што гэта вы так маркотна глядзіцё на сябе. /Глядзіць то на Паўлюка , то на старую/.

АЎДОЦЬЦЯ. Са старой маркотна!.. гэта ня тое, што вы... маеце аб чым пагаварыць - бачылі і пражылі не мала...

ПРОНКА. А ўжо-ж... Ой, жыцьце. /Пацягіваецца, пагледаючы на Аляксея/. Шмат ёсьцека аб чым гаварыць, адно толькі - ня ўсё і не для ўсіх зразумела... Аляксей, вы трошкі інакшы ад тутэйшых людзей - не чужы для вас сьвет шырокі.

АЛЯКСЕЙ /з гордасьцю/. А не зусім чужы.

ПРОНКА /прыбліжаецца да Аляксея/. Мы у двох - гэта адно, а яны што?.. сьлімакі!..

ПАЎЛЮК /пабачыўшы гэта/. Пронка! Падумай аб госьцях!..

ПРОНКА /са злосьцю/. І гэта госьць - што-ж гэта мне ня можна?

ПАЎЛЮК /мягка/. Можэ-б з'елі чаго?

АЛЯКСЕЙ. Хай ваша жонка раскажэ нам нешта з вялікаго свету!.. для мяне гэта ўсё не дзівота, але ўсё-ж такі чэлавек любіць успамянуць тое, што бачыў, на што глядзеў...

ПАЎЛЮК /раздае гасьцінцы/.

АДНА С КАБЕТ. Просімо, просімо! - можэ аб тым князю, што з вясковай дзяўчыны зрабіў вялікую паню у шоўках і залатых пярсьцёнках. /Агледае свае пацеркі/.

ПРОНКА /седзючы пры Аляксею, баламутна/. Аляксейка ласы на мае гісторыі...

ПАЎЛЮК /падходзячы - гнеўна/. Паганае жыцьцё, праклятае жыцьцё. Каб такога жыцьця людзі не зналі. Мне хацелася-бы, каб ты забылася аб тым, што жыла на сьвеці прад прыходам у маю хату...

АДНА С КАБЕТ. Хай Паўлюк не займае часу!..

АЛЯКСЕЙ. Бог з людзей робіць ігрыска: аднаго садзіць высока, а другога нізка!..

АЎДОЦЬЦЯ /ківаючы галавой, разжаленая/. Сьвятая праўда твая, Аляксей!

З'Я В А 6-ая.

Тые самые і ПАРАСКА .

ПАРАСКА /ідучы каля вакна сьпевае/.

Ой, у лузі, у дарозі
Расцьвела каліна,
Спарадзіла бедна ўдава
Салдацкаго сына...
Спарадзіла яна яго
У цёмнаі ночы,
Дала яму бела лічка
Ды чорные вочы.

/Скончыўшы, уходзіць/.

АЎДОЦЬЦЯ /да Парасксі/. Пекна пяе!..

ПАРАСКА. Хай будзе пахвалёны!

УСЕ. На векі вечные!..

ПАРАСКА. Хусткі ёсьцека.

ПАЎЛЮК. Чаму-ж не маюць быць?.. /Аддае пачку - яна разгледае/.

ПРОНКА /Аляксею, гледзячы яму ў вочы/. Якіе пекные вочы. І як умеюць глядзець...

АЛЯКСЕЙ /засаромяўшыся, адвертаецца і устае, а яна сядзіць, нагнуўшыся у яго сторону і валецаецца да яго/.

ПАЎЛЮК /пабачыўшы гэта, хмурыцца і падходзіць

да яе/.

АЛЯКСЕЙ. Ну, аставайцеся з Богам, Паўлюк: нам трэба йшчэ зайсьціся да сталяра, пасьля на паром. Апаведаньня паслухаемо другім разам. /Апошніе словы кажэ нагінаючыся да Пронкі/.

ПРОНКА /рагочэ/. Ха-ха-ха! /Усе выходзяць, а Аляксей на астатку; Пронка ўскаківае і бяжыць за ім/.

З'ЯВА 7-ая.

ПАЎЛЮК - ПРОНКА.

ПАЎЛЮК /хапае Пронку за плячо, затрымлівае, піхае на сярэдзіну хаты і зачыняе дзьверы; пасьле бярэ яе за рукі і цісьне іх так моцна, што Пронка крыкнула/. Прысягала жыць па Божаму, а дурства ў галаве.

ПРОНКА /вырываючы рукі/. А!..

ПАЎЛЮК. Прысягала?

ПРОНКА /са злосьцю/. Ну, дык што?..

ПАЎЛЮК. Атказывай хутчэй! Хутчэй атказывай! Прысягала?..

ПРОНКА /гледзячы на яго, памалу меняе выражэньне твару/. Эй, Паўлюк! Як табе прыгожа з гэтым гневам? Падабаешся ты мне!.. памаладзеў. /Кідаецца яму на шыю/. Міленькі!... мой брыляньцік!

ПАЎЛЮК /сурова/. А аб грэху ня думаеш? Сапраўды ня думаеш?.. Аляксея палюбіла?.. Кажы, але толькі праўду!

ПРОНКА /сьмяючыся/. Дурны!.. Вось ешчэ! Хай гэтаго хама чэрці! Так ён мне ў галаве, як прашлагодняя зіма. Яму мужычкі пахнуць. Не яго я люблю, а цябе, Паўлючок, мой ты міленькі, мой даражэнькі!..

ПАЎЛЮК /супакоіўся і гладзіць яе па галаве/. Ну, добра, добра, добра ужо!.. Каб толькі бяз грэху.

ПРОНКА. Можэ-б ты з'еў чаго? /Сядае і грызе цукеркі/.

ПАЎЛЮК /паднімае кніжку, каторую перад гэтым Пронка ненарокам скінула на зямлю/. З'ем пасьля... цяперака не галодны... але я маю да цябе, Пронка, адну просьбу, ды не маю адвагі.

ПРОНКА. Я для цябе, Паўлюк, усё зраблю, калі патраплю... /Грызе цукеркі/.

ПАЎЛЮК. Ну, калі ўжо ты такая добрая, то, будзь ласкава, навучы мяне чытаць: я ўжо даўно хацеў прасіць цябе. Вось толькі гэтаго завідую табе і іншым, што умееце на кніжцы Пана Бога хваліць. Цягацца па сьвеці я не любіў, дык і нічога ня ведаю, а ў кніжках аб усім напісана. Калісьці я кры-

хў разбіраў літэры, вучыў мяне адзін,- але ўжо забыўся, а цяперака з жонкай і гэта шчасьце узяў у хату. У кніжках ёсьць шмат спосабаў, каб зрабіць душу людзкую беленькай, як галубка.

ПРОНКА. Глупства душа, глупства галубка, але што па кніжках цікавые гісторыі апісываюць,- гэта праўда, і, калі хочэш, пакажу. Купі толькі лямэнтар.

ПАЎЛЮК. Куплю, далібог, куплю, але і на кніжцы можна - хаця-бы і на гэтай. /Бярэ с шафы кніжку, рассыпаюцца сьвятые абразкі/.

ПРОНКА /паднімаючы адзін/. Бачыш гэтаго анёлачка?.. Гэта памятка ад аднаго лекая, ў катораго я на сьмерць была ўлюбіўшыся у Гродні.

ПАЎЛЮК /нахмурыўшыся/. Пакінь ужо, пакінь гэтые паперкі!.. паганые яны, як ітваё даунейшае жыцьцё...

ПРОНКА /са злосьцю/. У цябе дык усё паганае... а абразок пекны. /Прыглядаецца да абразка/.

ПАЎЛЮК. Ну, пакажы!- Абецала навучыць...

ПРОНКА /грызе цукеркі/. Дай кніжку і глядзі: /паказвае яму/. Вось гэта першая літэра: "а", паўтары - "а"!

ПАЎЛЮК /падыймае высока брові, моршчыць лоб, падыймае губы, а рукі пад сталом на каленках так

ламае, што аж суставы трэшчаць/. "а", а гэта, а гэта?

ПРОНКА /грызучы усё цукеркі/. А гэта "б" - "о" - "г"... /Паўза/.

ПАЎЛЮК /як вышэй/. "о"/Абмыліўся/. Бачыш, Пронка, я да гэтага не прывыкшы, але, пачэкай, міленькая, крыху, і я прывыкну... /Чытае/.

ПРОНКА. Ось дурны!.. кажэ "а", калі - "о"... ось!.. мужыцкая галава!- Такі ты да чытаньня, як вол да карэты.

ПАЎЛЮК. Ну, Пронка, ня гневайся: я прывыкну пасьля, а цяперака ты, можэ спаць хочэш ужо, таму што зло да цябе прыступае... Я пайду на рэчку, а ты прыпільнуй вячэру... Дзякую, табе, Пранусько!
/Зложыўшы кніжку, кладзе яе на мейсцы/.

ПРОНКА. Вячэру прыпільную, але, што да кароў, дык даіць іх ня буду, а так сама і ваду насіць...
/са злосьцю/.

ПАЎЛЮК /узяўшы шапку/. Ну, ну, глупства...хай сабе будзе па твойму, каб толькі табе добра было і каб ты сама была добрай!.. /Пайшоў/.

З'Я В А 8-ая.

МАРЦЭЛЬКА - ПРОНКА.

ПРОНКА /хвіліну кратаецца каля печы і сьпевае/.

## А К Т III.

/Паміж другім і трэцім актам праходзяць тры гады. Сцэна прэдстаўляе тую самую хату Паўлюка, відаць толькі што даўно яе не прыбіралі:усё страшэнне запушчана. Німа люстэрка, скромная пасьцель; у куток сьмяцьцё. Пачынае вечарэць/.

### З ' Я В А І-ая.

ПАЎЛЮК - УЛЬЛЯНА - ПІЛІП - ВУРАДНІК - ДАНІЛКА .

/У атчыненых дзьвярох, праз каторые чутно, як падае дождж і вые вецер, стаіць Паўлюк;у аднэй руцэ ён трымае люльку, пыкаючы з яе, і што мінуту падносіць яе да губ, пасьля адыймае і апускае з ёй руку. На падворку гаманяць, здалёку чуцен крык: Па-а-ро-о-ом!" Паўлюк, нахіляючыся,глядзіць. Відаць, як Пiлiп і Данілка бягуць, а праз момэнт чутно, як пад'ежджае брычка пад дзьверы хаты.Уходзіць вураднік у мундзеры з ґузікамі і хворменнай шапцы; за ім Пiлiп і Ульляна/.

ПІЛІП /падыйшоўшы да Паўлюка/. Дзевер ня гневайся на нас, калі ласка, але мы цяперака Пана вурадніка праз рэку перавозілі і ўсё яму расказалі.

ПАЎЛЮК /кіўком галавы вітае вурадніка і с тру-

дом гаворыць/. А што вы гэтаму пану казалі.

УЛЬЯНА. А што гэта валакіта...

ПІЛІП /перэпыняючы/. Што Пронка недзе падвелася і столькі часу німа. Трэба-ж даведацца, што з ею?..

ПАЎЛЮК /востра, са злосьцю/. Чорт вас за язык цягнуў!..

ПІЛІП /скрабучыся ў галаве/. Я можэ-б і не казаў, але Ульяна пачала...

УЛЬЯНА. Але, але!.. Пане вураднік, уцекла.

ВУРАДНІК /разглядаючыся па хаці/. А што, Акунь, жонка табе, чую, прапала, сбежала, что-лі? Прапала? А можэт быть яе гдзе убілі, ці патанула, га? А чаму столькі врэмені паліціі у управленне не даложылі? Можэ-б пашукалі і знайшлі...

УЛЬЯНА /кланяючысь вурадніку у ногі/. Справедліва кажэ пан вураднік.

ВУРАДНІК. А ён не жалее. Пекная кабета сбежала, а ён нічэво. Стыдна табе! /Сьмяецца/.

ПАЎЛЮК /перэпыняючы яго сьмех/. Яна не ўцякла, не ўтапілася, ніхто яе не забіў... Да сваей радні пайшла...

УЛЬЯНА /цененька/. Ага!.. да радні пайшла, німа ведама толькі, калі вернецца...

ПІЛІП /засычэў за жонкай/. С-с-с-с!..

ПАЎЛЮК. Паліцію я не паведамляў і паведамляць ня буду, бо тут ніякая паліція не патрэбна. Я сам яе паліція.

ВУРАДНІК /нездаволены/. Вось, які горды!..Сматрі!.. Ты ей, зачіт, разрэшэніе дал?.. А?

ПАЎЛЮК /цьвёрда/. Даў.

ДАНІЛКА /каторы пры славах урараднік з'явіўся на парозі, сьмяецца, закрываючыся рукамі/.

ВУРАДНІК /гнеўна, апранаючы шапку/. Ну, калі так, то мне тут нечэво дзелаць. /Да Данілкі/. Ну, паезжай. /Пайшлі/.

ПАЎЛЮК /да выходзячых Піліпа і Ульляны/. А вы трымайце языкі за зубамі, бо хаця я і спакойны, гнеў свой паказаць патраплю. Якое вам дзела, што яна пайшла і калі вернецца? Калі-б яна і зрабіла нешта благое, дык мне, а не вам, вось што!Але яна нічога дрэннаго не зрабіла. Пайшла да радні і з маім пазваленьнем пайшла. І маўчыце. Каб я ніколі ня чуў вашай гутаркі аб ей!.. Чуеце?..

УЛЬЛЯНА /затрымаўшыся на парозі/. Ой, Паўлю - чок. Мусіць ты нас зусім ня любіш, калі над намі так здзекуешся і ўсё праз тую самую шэльму.

ПАЎЛЮК. Ня здзекуюся я над вамі, а толькі прашу і наказываю, каб вы не рабілі таго, што мне ня люба!.. а яна пайшла да радні, маючы мае пазвалень-

не, і мне добра ведама, калі вернецца. /Адвертаецца і ідзе у глыб хаты/.

УЛЬЛЯНА /выходзіць, махнуўшы рукой/.

/Вечарэе; праз прачыняные дзьверы падае свет з суседняй хаты; праз ваконцэ загледае месяц. З далёку далетае брэхня сабак. Крыху пачэкаўшы, чутны цяжкіе крокі; уходзіць скорчэная Аудоцьця і седае нізка каля Паўлюка, каторы сядзіць у куце на скрыні; сьвет ад месяца падае на іх абадвох/.

З'ЯВА 2-ая.

ПАЎЛЮК - АЎДОЦЬЦЯ.

АЎДОЦЬЦЯ /доўга маўчыць, пасьля шэпчэ/. Паўлюк!..

ПАЎЛЮК /бытцам спрасонку/. Чаго?.. Хто гэта?..

АЎДОЦЬЦЯ. Чаго гэта ты, Паўлюк, сядзіш усё ў хаці, як той вартаўнік? Чаму ты тут адзін, як той пень, тарчыш і вочы толькі вылупляеш? Пайшоў бы ці да людзей, ці лажыўся-б спаць, а то вось ешчэ падумаюць, што ты звар'яцеў, ці нешта на цябе нашло. Чуеш, Паўлюк?.. Выгледаеш ты, як-бы табе да сьмерці тыдзень астаўся...

ПАЎЛЮК. Чаго ты хочэш ад мяне, Аўдоцьця? Чаго ты прычапілася да мяне, як тая смала. Калі за-

хачу, то ўсю ноч так прасяджу, а табе якое дзела?.

АЎДОЦЬЦЯ. Вось і не прасядзіш! Я табе так марне згінуць не дам! Ці мала я хворых бачыла і выратавала ад сьмерці. і цябе выратую... /Пачэкаўшы , пахіляецца да яго і ціхенька гаворыць/. Паўлюк, а я табе нешта скажу аб Пронцы, чуеш? Тры тыдні ужо будзе, як Аляксей бачыў яе у горадзі...

ПАЎЛЮК /перэпяняючы яе/. Мне не патрэбны ніякіе весткі аб ей,- я сам усё ведаю...да радні сваей пайшла.

АЎДОЦЬЦЯ /устаючы/. А-а!.. але-ж холадна ў цябе ў хаці! Мусіць дні са тры не палена ў печы?.. /паўза/. Ці ты еў што сягоньня? Мусіць нічога, бо і ў печы агню не было. Ну, дай хаця сернікі! Распалю агонь і вячэру прыгатую. Ой! стары ты,а дурны!.. Давай сернікі!.. Гдзе сернікі?

ПАЎЛЮК. Ці я ведаю?.. Пашукайце самі, будзьце ласкавы.

АЎДОЦЬЦЯ /шукае у цёмнай хаці - на печы, на стале, на лавах; шукаючы кляне/. Каб іх паляруш кінуў!.. Каб яны скруціліся!.. Каб іх хвароба,тых сернікаў... /Знайходзіць сернікі і паліць лучыну, крыху пачэкаўшы, кажэ/. Вось і агонь!.. Будзе і вячэра, і цяпло, і весела у хаці... З'емо заціркі з салам, пагукаем. Бульбы чысьціць ня буду - не

насьпела-б і да ночы. Усё зраблю, каб толькі цябе вылячыць ад гэтай паскуднай хваробы!.. і вылячу - не такіх я вылечывала!.. Задала табе гэтая шэльма, але я і гэты смутак адроблю...

ПАЎЛЮК /ледзьве блыснуло ясьнейшае полыме, ён падскаківае да яе і вырывае лучыну/. Не паліце агню!.. Далібог, агню не паліце!..

АЎДОЦЬЦЯ /астаўбянеўшы/. Чаму?.. Звар'яцеў!.. далібог, звар'яцеў! Да чаго ты цяперака падобны.. Каб ты пабачыў сам сябе, то спудзіўся-бы...

ПАЎЛЮК. Не паліце агню!.. Змілуйцеся, не паліце!

АЎДОЦЬЦЯ. Чаму?..

ПАЎЛЮК. Не пытайцеся. - Толькі, будзьце ласкавы, не паліце агню!.. /Крыху пачэкаўшы і перавёўшы дух, - цішэй/. Мне здалося, што гэта яна стаіць ля печы і распалівае агонь.

АЎДОЦЬЦЯ /плюнуўшы/. Цьфу!.. Згінь ты, прападзі!.. /Думае, падпёршыся рукой, пасьле падходзіць да Паўлюка, каторы сядзіць пад вакном і шэпчэ яму/. А Аляксей вестачку аб ей прынёс...

ПАЎЛЮК /цьвёрда/. Мне ніякіх вестачак аб ей ня трэба! Да радні сваей пайшла і з майго дазволеньня.

АЎДОЦЬЦЯ /са злосьцю/. Ці ты, Паўлюк, дурыш сам сябе, ці другіх хочэш ашукаць?.. На што гэтая гу-

тарка, калі ўсе добра ведаюць, што яна не да радні пайшла, але уцякла ад цябе с тым панскім лякаём... Я і сама не раз і не два бачыла, як яна да двара бегала, а калі не было як пабягчы, то пасылала гэтую шэльму, Марцэльку. Гэтаго лякая я так сама бачыла - с кручэнымі валасамі і у сурдуці... Ад яго нясло чымсьці такім - ні то бобам,ні то елкім салам... Марцэлька казала, што гэта парфуны і памада... Чорт яго ведае... Пронка панічом яго называла; скакала з ім у палацы, калі паноў не было, і наскакала табе і сабе бяду. Ты тады быў на рацэ - лавіў рыбу і ў горад вазіў... /Момэнт маўчыць/. Падгаварыў яе той лякай, - казаў, што забярэ яе ў горад, будзе яе на танцы і усюды вадзіць ; яна і паляцела за ім. А ты выдумаў радню... Да радні пайшла!.. Табе здаецца, што ты іншых здурыш, а ты сам дурны. Мы ўсе маўчалі і думалі, што паразумнееш, а ты ўсё сваё...

ПАЎЛЮК /крыху пачэкаўшы, глуха, памалу/. А прысягала...

АЎДОЦЬЦЯ /крыху пачэкаўшы, не спакойна/. Ці ж ты і запраўды толькі цяперака ад мяне даведаўся?

ПАЎЛЮК /пачэкаўшы/. А прысягала...

АЎДОЦЬЦЯ. Баба сваё, а чорт сваё. Што хочэш , чэлавечэ, кажы, а ён толькі дзівуецца, ды дзівуіц-

ца... Чаго ты здівакаўся?.. /памаўчаўшы/. Ты Паўлюк, пераэгнайся вялікім крыжэм, плюнь на гэту шэльму і па стараму ціхенька, спакойненька пачынай жыць. Маеш сваю хату, рэмесло маеш, сякіе-такіе грошы і чаго табе маркоціцца і убівацца...Ой-ой-ой! Каб гэтак усім было, як табе!.. Плюнь на ўсё гэта!.. Ні адзін чэлавек без бяды не пражыве - вось, у Карусі пала карова; у Мікулы сьвіньні пахварэлі; або ўзяць Панаса - сын зрабіўся разбойнікам, а у Івана - конь як закульгаў, дык і цяпер кульгае. А твая беда!.. Незнаёмую валакіту выцягнуў з балота і хацеў, каб яна добрай была... Чортава дачка вярнулася да свайго бацькі - чорта.

ПАЎЛЮК. А ведаеце, кума, што ў ваўсім, што сталося, мая віна!.. Ні чыя іншая, а мая толькі. Перш-на-перш, мала ад ей малітвай і навукай чорта адганяў, а другое - калі пазнаў яе характэр і дагадываўся аб лякаю гэтым, не пераставаў пакідаць яе адну у хаці. Трэба было лепш яе пільнаваць, а так яна цяперака, дзякуючы мне, прапала; я загубіў сябе і яе. Йшчэ яна можэ нарэкаць на мяне, ня то, каб я меўся на яе нарэкаць...

АЎДОЦЬЦЯ. Здурнеў... Чыста здурнеў!.. Як я бачу, то я сягоньня с табою да ладу не дайду ... Шкада языка. Пайду я да сваіх - хлявы зачыняць, а

ты кладзіся спаць. Можэ Бог верне табе розум, а я заўтра загляну да цябе, бо хоць ты і здурнеў, але жаль цябе... /Выходзіць і зачыняе за сабою дзьверы/.

ПАЎЛЮК. /доўга сядзіць, нахмурыўшыся, пасьля, паўзіраўшыся на дзьверы, ці зачынены, бярэ с шафы кніжку, кладзе яе на стале, запаліўшы раней лямпу, і, сеўшы, па-малу пачынае чытаць/.

З'ЯВА 3-ая.

ПАЎЛЮК - ПРОНКА.

ПАЎЛЮК. Па-лю-бі Ма-ры-ю, бо я-на ёсць бра-май да не-ба!.. /Пачэкаўшы/. Ой, каб-жэ гэта чэлавек па сьмерці увайшоў у гэтую браму!.. /Пачэкаўшы, перэжэгнауся і злажыў рукі на каленах/. Божэ міласерны! Змілуйся над яе грэшнай душой!.. /Са сьлезамі/. Змілуйся над яе грэшнай душой./У трубе завывае вецер; брэшуць сабакі і раптам ціха скрыпнулі дзьверы і чутна крокі у сенцах/.

ПАЎЛЮК /падыймаючы галаву/. Хто?.. Хто тутака?.. /Да сябе/. Мусіць зноў Аўдоцьця./Крокі чутны ясней. Паўлюк устае, адчыняе дзьверы і пытаецца/. Хто тутака?.. /У пацёмках чуцен голас:/ "Гэта я!..

З'ЯВА 4-ая.

ПРОНКА - ПАЎЛЮК.

ПРОНКА. Гэта я - Пронка!

ПАЎЛЮК /хапаючы яе за абедзьве рукі цягне,да лямпы/. Ты?.. ты?.. ты?..

ПРОНКА /у мокрай хустцы, у падзёртых чэравіках, трасучыся ад холаду/. Я!.. ня гневайся!..

ПАЎЛЮК. Вярнулася, а я і не спадзеваўся ... Спярша спадзеваўся, а пасьля страціў надзею...

ПРОНКА /адступаючы да дзьвярэй/. Калі можна мне застацца, то добра, а калі не, то я сабе ўраз і пайду.

ПАЎЛЮК /сьмяючыся/. Вось, дурная! Распранайся хутчэй, а то йшчэ захварэеш ад гэтай макраты. /Зрывае з яе хустку; яна астаецца у падзёртым андараку і старым мужчынскім пальтоці. Ад холаду зубы яе ляскаюць; ён садзіць яе на лаві і становіцца прад ей/. Такі вярнулася... такі зноў вырвалася с чартоўскіх капцюроў. Пазнала такі, гдзе яе дабро і збаўеньне. Ой, мая-ж ты бедная , мая нешчасьлівая! Вось ўраз-жэ распалю агонь,дам гарачаго крупніку і прыгатую гарбаты... сагрэешся і лепш табе стане...

ПРОНКА. Ой!

ПАЎЛЮК. А што? Пэўне хворая?.. Пэўне у сярэ-

дзіні баліць. Шмат бяды, мусіць, спазнала!.. Ўраз агонь будзе і ўсё будзе... Трэсак німа... каб іх! ... у сенцах пакінуў!.. пачэкай крыху! /Хочэ бегчы/.

ПРОНКА /ускаківаө/. Ой! Ня йдзі туды, ня йдзі.

ПАЎЛЮК /са страхам/. Чаму?

ПРОНКА /трасучыся і ламаючы рукі/. Ой! што я зраблю? што з гэтаго будзе?.. Калі у пацемках пойдзеш, то наступіш і задушыш, а калі са сьветлом, то пабачыш і ўраз-жэ мяне прагоніш! Што мне нешчаслівай рабіць?.. Што з гэтаго будзе?.. Божэнька! Прачыстая Двева! Ратуйце мяне, бедную!..

ПАЎЛЮК. С чаго што будзе?.. на каго я тамака наступлю?.. Хто тамака ёсьць у сенцах?..

ПРОНКА /перамогшы сябе/. Дзіце.

ПАЎЛЮК /астаўпянеў, пасьля, як аўтомат, падыходзіць да стала, бярэ лямпу і ідзе у сенцы/.

ПРОНКА /сачыць непрытомным паглёдам за ім і за кожнымі яго рухамі/.

ПАЎЛЮК /праз момэнт вертаецца; ня гледзячы на яе, кладзе на лаўку нешта заверненае і кажэ, крыху памаўчаўшы/.

З ' Я В А 5-ая.

ПРОНКА - ПАЎЛЮК.

ПАЎЛЮК. Чаму-ж ты адразу ў хату ня ўнесла?..

Як шчанё на зямлі кінула...

ПРОНКА /прыбліжаецца да яго, але ўраз-жэ адступае назад/. Баялася...

ПАЎЛЮК /машынальна ідзе да печы і стаўляе гаршчок і чайнік; пасьля выймае з шафы хлеб і нож і, ня гледзячы на яе, кажэ/. Ідзі есьці! /Дзіцё плачэ; Паўлюк глядзіць на Пронку, каторая нават не варушыцца/.

ПАЎЛЮК. Чаму дзіцё не развернеш?.. можэ хочэш, каб яно задушылося?.. шэльма!

ПРОНКА /падходзіць, развaрачывае дзіцё з лахманоў і садзіць каля сябе/.

ПАЎЛЮК. Што-ж ты сядзіш, як пані?.. Паднясі ягосюды і накармі - чуеш? ну!..

ПРОНКА /падходзіць да стала з дзіцянём, садзіць яго на лаві, дае кавалачак хлеба і сама седае пры ім, злажыўшы рукі на каленах/.

ПАЎЛЮК /нясучы міску і стаўляючы яе прад Пронкай/. Еш і дай дзіцяці!

ПРОНКА /корміць дзіцё, але сама ня есьць/.

ПАЎЛЮК. Чаму сама не ясі?

ПРОНКА. Не магу.

ПАЎЛЮК /памаучаўшы/. Хрышчонае.

ПРОНКА /сперша ціха, а потым ажыўляючыся/. А ня ўжо-ж!

ПАЎЛЮК /памаўчаўшы/. А як завецца?

ПРОНКА. Цыпрук.

ПАЎЛЮК. Цыпрук!.. /Памаўчаўшы/. Колькі яму будзе?..

ПРОНКА. Год і восем месяцаў.

ПАЎЛЮК /памаўчаушы/. Кладзіся і дзіцё палажы пры сабе, а я расплю на лаві.

ПРОНКА /пасьля доўгай паўзы устае, хочэ падыйсьці да яго, але баіцца/.

ПАЎЛЮК. Чаго хочэш?

ПРОНКА /цалуе яму руку/.

ПАЎЛЮК. Ну, ідзі ужо спаць!.. ідзі! /Кароткае маўчаньне; пасьля Паўлюк глядзіць на дзіцё, на Пронку і, адвертываючы вочы, кажэ, хрыпла, парушэны/. Не магу!.. Божэ мой!.. Ніяк не!.. не магу!..

ПРОНКА /туліць дзіцё да сябе/.

ПАЎЛЮК. Не... не хачу!.. За нішто не хачу!.. Што мне рабіць?.. /Даўжэйшая паўза/.

ПРОНКА /плачучы,да Цыпрука/. Хадзі!.. Для нас тутака німа мейсца... Бяздольные мы сіроты!.. гоняць!.. /Завертае дзіцё у хустку/.

ПАЎЛЮК /востра/. Куды хочэш ісьці?.. На голад?.. забіць дзіцё... Але... добрая с цябе маці!..

ПРОНКА. А што мне рабіць? У цябе астацца на вачах?.. Вінавата я і пайду.

ПАЎЛЮК /змагаецца з сабой, а пасьля глуха кажэ/. Астанься з ім!.. /Паказвае на дзіцё/.

ПРОНКА /плачучы, валіцца яму да ног/.

ПАУЛЮК /пехіляецца, падыймае яе і садзіць каля сябе/. Ціха! ціха!.. Ўжо ціха! Мая ты бедная, мая ты, мая нешчасьлівая!..

ПРОНКА. Ад сьмерці ты мяне, Паўлючок, ой, даражэнькі ты мой, залаценькі! ад сьмерці ты мяне выратаваў. Я ўжо пастанавіла, што, калі ты мяне ня прымеш, прагоніш, дзіцё пакіну дзе небудзь пад парогам, а сама атручуся... /Выймае паперку с кішэні/. Бачыш?.. Атрута!

ПАЎЛЮК. У Імя Айца і Сына!.. І на гэта чорт цябе падбіваў... Скуль ты ўзяла атруту?..

ПРОНКА. Беда і горэ падсунуло мне яе... Наелася-ж я яго даволі!.. Пакінуў мяне гэты цаганец! Каб яму цяжкай сьмерць была!.. У бальніцы і у вастрозі сядзела я... У вастрозі мяне і навучылі, скуль дастаць гэтаго золата... Была тамака такая, такая, што атруціла мужа...

ПАЎЛЮК. А за што ты сядзела?

ПРОНКА. За злосьць!.. абліла адну варам, за тое і засудзілі; сядзела я ў вастрозі і шмат чаго

мяне тамака навучылі за тры тыдні, што я там была.

ПАЎЛЮК. Мусіць ты а Богу зусім ня думала, а і я кепска рабіў, што з самага пачатку не прывучыў цябе да Бога і малітвы; вось, чаму ты ізноу з добрай дарогі да чорта павярнула.

ПРОНКА. Чорт ва мне сядзіць...

ПАЎЛЮК. Ну, Пронка, цяпераках будзем разам пацеры казаць, ты павінна на голас за мной наўтараць.

ПРОНКА /становіцца на калені, але адначасьне пачынае плакаць, хліпаючы/.

ПАЎЛЮК /падыймае яе і прыціскаючы да сябе, каже/. Ой, Пронка, як я цябе люблю!.. страшэнне люблю цябе! Ты ўжо, мусіць, цяпераках будзеш добрай і сумленнай,- я бачу ўжо, што ты і сама гэтага хочаш... Ой, як я цябе люблю, мая ты бедненькая!.. Як я люблю цябе!..

ПРОНКА. А яго, яго будзеш ненавідзець?.. /Паказывае на заснуўшае дзіцё/.

ПАЎЛЮК /гледзячы на яго, змагаецца з сабой /. Яно бязвінно... Стварэньне Божае... вось, ведама, сірата...

ПРОНКА. А табе ня сорам будзе людзям глянуць у вочы...

ПАЎЛЮК. Ой! дурная ты, дурная! Чаго саромяцца. Сорам грэшыць, а мець літасьць над сіратою -

ніякога сораму німашака. Я Богу за яго двякую, бо пры ім зло ад цябе хутчэй адступіцца і ты лепшаю будзеш.

ПРОНКА /гледзячы на яго/. Які ты добры!..

ПАЎЛЮК /памаўчаўшы/. Усе казалі, што ня верніцца, вярнулася... /Гладзіць яе па галаве/.

ПРОНКА /ажыўляючыся/. Хто казаў? Мусіць сестра.

ПАЎЛЮК. І дзевер, і сестра.

ПРОНКА. Яны, падлы, хацелі-бы, каб мае вочы гэтаго сьвету не бачылі. Ведаю я!.. у вочы мне будуць лезьці... але хай будуць асьцярожны з маім дзіцянём і са мною...

ПАЎЛЮК. Ціха! ціха!.. Скрыўдзіць цябе не пазволю, хоць гэта і сестра...

ПРОНКА /ня слухаючы яго/. Хамы!Яны умеюць тольксі есьць і піць - душы-ж не разумеюць... Ой. доля-ж мая ліхая! Сірата я на сьвеці!..

ПАЎЛЮК. Ціха! Ціха! Ужо ўсё скончылося - ізноў па Божаму будзеш жыць.

ПРОНКА /цалуючы яго ногі/. Паўлючок!мой ты родненькі баценька!..

ПАЎЛЮК /падыймае яе і становіцца прад ею,а яна прыгартае да сябе дзіцянё; памаўчаўшы, Паулюк кажэ/. Ну! чаго-ж стаіш? Час ужо класьці дзіця спаць. Будзь, як у сябе у хаці і рабі, што хочэш і як хо-

чэш... Цяперака ты такая самая гаспадыня, як і перш была, а я падбягу да сястры і раскажу, што ты вярнулася... а казала Ульляна, што ня вернешся, а ты такі вярнулася. /Адходзіць/.

ПРОНКА /перш стаіць на мейсцы,- пасьля кладзе у ложка Цыпрука, прыкрывае яго і пачынае сама распранацца; нехта стукнуў кіём у вакно і чуцен хрыплівы голас/.

З'ЯВА 6-ая.

МАРЦЭЛЬКА - ПРОНКА

МАРЦЭЛЬКА. Кірыэ Алейсон, Хрыстэ Алейсон! - Вотчэ з неба Божэ...

ПРОНКА /падбегае да вакна і адчыняе яго/. Марцэлька. А я ўжо думала, што ты памёрла. А мая-ж ты даражэнькая, залаценькая!..

МАРЦЭЛЬКА /трасучы галавой/. А,а,а! Так ты ізноў такая самая гаспадыня, як і раней была?.. Божэ ўсемагушчы!

ПРОНКА /паўтараючы/. Але!.. такая самая!..

МАРЦЭЛЬКА. З далёку бачу; стаіць твой і пры ім... Здзівавалася так, што аж ногі затрасліся. Ой, найсалодшы Ты Ісусе!.. думаю... хіба вочы лгуць... і не салгалі. Ну, кажы, калі Бога мілуеш, што с табой было?- дзе той? і як ты с Паў-

люком пагадзілася?..

ПРОНКА /парушэная/. Той?.. А хай яго хваро - ба!.. Каб ён скрось зямлі пайшоў. - Не хачу аб ім і ўспамінаць!.. Але гэты, як бацька, даравау...не прагнаў, як сабаку... і з дзіцяцей... добры.. /у яе падступаюць сьлезы/. Добры!.. Такога добраго на ўсім сьвеці мусіць ня знойдзеш.

МАРЦЭЛЬКА. Запраўды, добры...

ПРОНКА /хапаючыся за галаву/. Ай! Марцэлька, каб ты ведала, якую я бяду маю з гэтай галавой?- баліць і баліць. І ў бальніцы была, і лекі прыймала, а боль як была, так і ёсьць. Вось, здаецца, што зараз павалюся. Да ўсяго гэтаго я цяперака запрадалася яму у няволю з душою і целам. Здароўе я загубіла, дзіцё на карку маю, і німашака для мяне іншаго ратунку, як у гэтай хаці і з гэтым чэлавекам жыць. Ох! у чорную гадзіну я на гэты сьвет прыйшла.

МАРЦЭЛЬКА. Аднакжэ-ж, мая міленькая, шчасьлівая ты! Ой! якая шчасьлівая, што дастала такога чэлавека! Не жарты, міленькая, які ён добры...

ПРОНКА /хапаючыся рукамі за галаву/. Я-ж і сама ведаю, што за гэтую самую дабрату у няволю яму запрадалася.

МАРЦЭЛЬКА /задумаўшыся/. Ой, доля-ж мая,до-

ля! Чаму ты мне такога чэлавека у малодшых гадох не паслала?.. Чаму ты мяне, як тую траўку у полі, адну на гэтым сьвеці пакінула?.

ПРОНКА. Ага! добра табе так казаць, калі ты ўжо пастарэла, як той грыб. У моладасьці чэлавек сьвету, вясельле хочэ.

МАРЦЭЛЬКА. А колькі-ж табе гадкоў будзе, мая міленькая?

ПРОНКА. А ўжо трыдцаць восвмы на Грамніцы пачала.

МАРЦЭЛЬКА /ківаючы галавой/. Ой, дык ты ўжо і не маладая, не дзіцё. Ужо і саракоўка не далёчка -"сорак лет - бабскі век!"

ПРОНКА. Мужыцкая прыказка... Ці-ж гэта праўда? А ей! як-бы йшчэ за мной леталі, каб толькі здарова была!..

МАРЦЭЛЬКА. Але, праўда! - чаму-ж не?.. цененькая ты такая, ручкі твае, як у дзіцяці, маленькіе, і вочы такіе...

ПРОНКА /ціха/. Хавайся! - ён ідзе. / Крыху пачэкаўшы, выгледае праз вакно/. Не, гэта ня ён. ...Глянь, Марцэлька! - гэта-ж Даніла!.. Які пекны хлапец зрабіўся з яго!..

МАРЦЭЛЬКА /ціха сьмяючыся/. Ат!.. Дзяцюк малады, дык і прыгожы.

ПРОНКА. Гэта нічога, што малады, але ён такі цененькі, складны, як паніч

МАРЦЭЛЬКА /хітра/. Можэ-б гэтаму дзяцюку шапнуць, што ты аб ім казала?.. а? Зрадзеў-бы!.. яму і у галаву ня можэ прыйсьці, каб хто яго хваліў , ды йшчэ хто...

ПРОНКА / с перапуду адскочыла ад вакна і шэпчэ/. Уцекай!.. Паўлюк ідзе!.. /Зачыняе вакно/.

ПАЎЛЮК /уходзіць/.

З а в е с а.

## А К Т ІУ.

/Хата Паўлюка - так як у другім акці; на парозі скорчыўшыся сядзіць Пронка, - рукі яе трасуцца, цяжка дыхае. За дзьвярыма, каторые адчынены, гоман: павышэны голас Данілкі, гнеўны голас Піліпа, ад часу да часу перэрывючыйся крык Ульляны і плач дзяцей/.

### З ' Я В А І-ая.

ПІЛІП - ПРОНКА -- ДАНІЛКА.

ПІЛІП /за дзьвярыма, бьючы Данілку/. Садома і Ґамора! За цябе-ж гром Божы хату спаліць!.. Ён жэ быў для цябе, як родны дзядзька... А ты цяперака з яго бабай!.. А да плуга, да цэпа - не за спадніцамі увіхацца!.. І яшчэ да каго? - Да чужых жанок!.. а каб цябе хвароба!.. Вон с хаты! - чуеш?- Вон!.. Ідзі на валацугу па съвеці, у найміты ідзі, а с хаты - вон! Эх!.. нячысьцік праклятый!.. Вон!..

ДАНІЛКА /плачучы/. Ты не маеш права выганяць мяне с хаты. Такая яна твая, як імая: мы дзеці адных бацькоў.

ПІЛІП. А хто табе бацькай быў... Ці на тое я гадаваў і карміў цябе?.. і розуму вучыў, каб ты Садому і Ґамору рабіў, каб ты паскудзіў чужые гнёв-

ды?.. Ты!.. /Чутно біцьцё, крыкі, енкі/.

ПРОНКА /на парозі хаты/. Божэ Міласерны!.. Пачуе... Далібог, пачуе! /Агледаецца на камору, дзьверы ад каторай папраўдзі адчыняюцца і паказваецца, нерасчухаўшыся яшчэ ад сну Паўлюк; ён стаіць на парозі і Пронкі не бачыць. У гэтую самую хвіліну у хату уваліваецца Піліп, і цягне за сабою Данілку/.

З'ЯВА 2-ая.

ПІЛІП - ПАЎЛЮК - УЛЬЛЯНА.

ПІЛІП /да Паулюка/. Садома і Ґамора!.. Злавіў іх! Злавіў абаіх у стадолі!.. /Паказываючы на Пронку/. Сука!.. Гані вон с хаты!.. А гэтаго шэльму, падлеца, забью! забью!.. далібог, забью!..

УЛЬЛЯНА /увайшоўшы, падае у ногі Піліпу /. Ціха!.. маўчы!.. Піліп, ой!.. Піліп, што ты робіш?.. Маўчы!.. ты яго забьеш гэтак... глянь на яго!../Паказвае мужу рукой на Паўлюка, каторы момэнт стаіць ні жывы, ні мёртвы/.

ПІЛІП. На што маўчаць?.. Хай ведае!.. Ён-жэ мужык, не баба. /Штурхаючы і бьючы Данілку выкідае с хаты і сам выходзіць за ім. Перапуджэная Ульляна выходзіць так сама/.

З ' Я В А 3-ая.

ПРОНКА - ПАЎЛЮК.

ПРОНКА /паўзе да ног Паўлюка/. Ня вер ты ім, Паўлюк!.. ня вер!.. гэта не праўда - зумысьля.

ПАЎЛЮК /моўчкі хапае яе за плечы і неколькі разоў кідае на зямлю; потым выходзіць с хаты; апіраецца тамака аб сьценку і плачучы, кажэ сам сабе /. Вось, тыкі ўжо немашака для яе ратунку!..Німа збавеньня, а для мяне шчасьлівай долі на сьвеці!..Божэ мой Ўсемагушчы! Што мне цяперака рабіць?.. /Хістаючыся ідзе на падворак/.

З ' Я В А 4-ая.

ПРОНКА - УЛЬЛЯНА.

ПРОНКА /адна - праз момэнт - у тым палажэньні, у якім пакінуў яе Паўлюк; посьле, ускочыўшы і са злосьцю, як шалёная пачынае крычаць/. А, а!.. Пабіў!.. навдзекаваўся!.. Каб яму так Бог не дараваў ніколі, як я не дарую!- да сьмерці гэты здзек памятаць буду... Сорам!.. сорам!.. / На падворку аддаляючыся гоман. Убегае Ульляна, несучы Цыпрука - кідае яго пад ногі Пронкі і кажэ/.

УЛЬЛЯНА. Маеш сваё дзіцё. Чаму яго лепш не пільнуеш заместа таго, каб шапні с хлапцамі заво-

дзіць. Каб не я, то ад яго́ горсьць ко́стачэк асталася-б; с-пад во́за я яго́ вы́цягнула. Калі́ радзі́ла, то і сьцеражы́ яго́!.. Але, му́сіць, така́я ты і ма́тка, як жо́нка!.. Шэльма, а не ма́тка!.. /Выбега́е/.

ПРОНКА /кіда́ецца за ею з ненаві́сьцю/. Забью́! далібо́г, забью́! Вазьму́ за го́рла і задушу́, як суку́.

З'ЯВА 5-ая.

ПАУЛЮ́К - ПРО́НКА.

ПАЎЛЮ́К /ухо́дзячы, чу́е ўсё, хапа́е Про́нку за ру́кі і прыціска́е да зямлі́/. Не забье́ш! не забье́ш!.. Цярпі́!.. Паку́туй!.. апа́мятайся!.. Аб убі́ўствах ня ду́май!.. Ты!.. /Пуска́е яе/. Ёзу. Хры́сьце Мілασе́рны!.. Што мы табе́ дрэннаго зрабі́лі?.. /Бярэ́ дзіцё на ру́кі/.

ПРО́НКА /кіда́ецца да яго́/. Не чэпа́й яго́! Чу́еш? гэ́та мае́ дзіцё, па́нскае, а ты мужы́к, разбо́йнік... Мужы́к, мужы́к, подлы мужык! Чу́еш?.. /Хо́чэ вырваць у яго́ Цыпрука́ - Паўлю́к не дае́/.

ПАЎЛЮ́К. Апа́мятайся, Про́нка! Гэта-ж ты мне тады на магілках перад сьвятым крыжэм прысягала... Я-ж табе́ нічо́га дрэннаго не зрабі́ў. За што ты мяне́ кры́удзіш? Сагрэ́шыла ты, дык апамятайся!.. Калі́ ты з дзіцём да мяне прыйшла, я-ж быў для цябе, як бацька... па́мятаеш?.. Я злітаваўся над табой, як

над тою птушкай без гнезда, а ты цяперака што робіш? У прыдатку, ты яшчэ са злосьцю кідаешся на мяне...

ПРОНКА. Біў ты мяне?.. чуеш?.. біў!..

ПАУЛЮК. Грэшны я!.. Чорт прыстаў... але ты ня злуй, Пронка, я ўжо табе нічога не зраблю!..Чуеш?. не зраблю!.. апамятайся!.. /Стаіць момэнт, глядзячы на Пронку, катораяя хапаецца за галаву/.

ПРОНКА /стогне/. Езу! Мая галава!.. А каб вас паляруш!.. Каб вам дабра не было!

ПАУЛЮК. Ціха!.. Пронка, не кляні!.. грэшная ты і патрэбуеш змілаваньня Божаго!.. не кляні!..Я ўжо табе нічога казаць ня буду, толькі ты апамятайся!.. /Апошніе словы кажэ выходзячы/.

ПРОНКА. Пабіў!.. пабіў!.. Божэнька!..

ПАУЛЮК. Двіцяці есьці даць трэба - нагатуй крупені!.. яно-ж бязвінна!.. нагатуй есьці. Ты-ж такі матка!.. Я ўжо пайду с тваіх вачэй, але ты толькі апамятайся і... нагатуй!.. /Пайшоў/.

З'ЯВА 6-ая.

ПРОНКА. Нагатую я табе! Ой, нагатую. Вось, наешся!.. Сыты ўжо будзеш. Такі сыты, што ўжо ніколі табе не захочэцца. У гадзіну сьмерці даведаешся,як гэта на такую, як я, руку падыймаць. /Хапаючыся за

галаву/. Ой! галава!.. мая галоўка!.. /Хістаецца ідучы, як пьяная. Нахіляецца над скрыняй, выймае тую самую паперку з атрутай, каторую у трэцьцім акці паказывала Паўлюку; парашок сыпле у гаршчок са стравай, а паперку кідае на зямлю так, што яе можна бачыць/. Божая кара на мяне за тое, што ня ўмела сябе шанаваць і ўлезла паміж мужыкоў. Вось, да чаго дайшла!.. Кара Божая!.. /Мешае памаленьку у гаршчку. Вусны яе заціснуты. Адстаўляе на бок гаршчок і паправіушы валасы, сцірае лаву; пасьле, выймае са скрыні нейкую работу і сеўшы каля вакна, пачынае рабіць яе і падсьмейваецца нейкім дзіўным, непрытомным сьмехам/.

З'ЯВА 7-ая.

ПАЎЛЮК- ПРОНКА.

ПАЎЛЮК /увайшоўшы, ласкава пм[illegible]аецца/. Ці ёсьцека што з'ёсьці.

ПРОНКА /не кідаючы шыць/. Ёсьць.

ПАЎЛЮК. Улій у міску і дай.

ПРОНКА. Сам вазьмі.

ПАЎЛЮК /бярэ гаршчок і налівае/. Цыпрука я пакінуў у Аўдоцьці!.. хлапец заснуў. /Сеў, жэгнаецца ломіць хлеб і есьць/.

ПРОНКА /глядзіць на яго спады-лба, глупа пад -

сьмеваецца; во́чы яе́ зло блішча́ць/.

ПАЎЛЮК /перэстае́ е́сьці, кладзе́ лы́жку, плюе́ і ка́жэ/. Не сма́шна - го́рка; му́сіць кру́пы былі́ перэстарэ́лые і тухлые...

ПРОНКА /шэ́птам да сябе́/. Ту́хлые...

ПАЎЛЮК /скіда́е пама́лу з сябе́ сермя́гу/. Не́шта у галаве́ шумі́ць... Сон мо́рыць!.. ой!.. ля́гу, адпачы́ну... мо́жэ засну́... /Кладзе́ сермя́гу пад галаву́ на ла́ві, кладзе́цца сам і засыпа́е/.

ПРОНКА /кладзе́ рабо́ту на кале́нах і глядзі́ць на яго́, пасьля́ закрыва́е твар рука́мі і так сядзі́ць ці́ха. Паўлю́к застагна́ў - яна̀ ўска́ківае і бяжы́ць да дзьвярэ́й, у като́рых ста́нула Марцэ́лька/.

З'ЯВА 8-ая.

МАРЦЭЛЬКА - ПРОНКА.

ПРОНКА /здаўленым го́ласам/. Марцэ́лька! /Кіда́ецца ей на шы́ю і пачына́е пла́каць/.

МАРЦЭЛЬКА /мо́ўчкі пака́зываючы на Паўлюка́, ка́жэ/. Ці́ха, мі́ленькая, а то яшчэ́ прачне́цца!

ПРОНКА. Не прачне́цца ён ужо́ ху́тка, а мо́жэ і ніко́лі не адчы́ніць сваі́х вачэ́й на гэ́ты сьве́т...ён ужо́ ніко́лі мяне́ біць ня бу́дзе!.. /Сьмяе́цца/.

МАРЦЭЛЬКА. Чаму́?.. Што гэ́та на цябе́ найшло́?..

ПРОНКА /гро́зіць кулако́м Паўлюку́/. Я яму́ ужо́

так зрабíла... што ня бýдзе...

МАРЦЭЛЬКА Мая́-ж ты мíленькая, а што-ж ты ямý такóга задалá?

ПРОНКА /як ранéй, зло сьмяючы́ся, шэпчэ на вý-ха/. Атрýціла. /Сьмяéцца/.

МАРЦЭЛЬКА. У Імя́ Айцá і Сы́на! Ці ты зварья́цела? - гэ́такое казáць...

ПРОНКА /ківáючы галавóй/. Мóжэ і зварья́цела... алé ён ужó мяне біць ня бýдзе!.. Вы́йду за Данíлку. ...чýеш? За Данíлку...

МАРЦЭЛЬКА. Бóжухна мой! Прóнка, ты не хлусíш?..

ПРОНКА /бьéцца у грýдзі/. Далібóг!.. а той такí прыгóжы ды склáдны!.. /Сьмяéцца/.

МАРЦЭЛЬКА /на гóлас/. Людзі, ратýйце. Ёзу. Марыя! Сьвяты Язэпе!.. Айчэ́ наш, катóры ёсьць ў нéбі!.. Сьвяты́ Антоні!.. Прэсьвятáя Мары́я Дзéва!... Кíрыэ Алéйсон!.. /Падаéцца назáд, жэгнáецца спý-джэная/.

ПРОНКА /глядзíць на Паўлюкá, катóры стóгне праз сон; усьмехáецца і ківáе галавóй/.

МАРЦЭЛЬКА. Ах! шэльма-ж с цябé!.. Ах! чорт цябé аплýтаў. Ой, галóванька мая!.. чаго я сюды прыйшлá?.. на што ты мне аб гэ́тым казáла?.. Яшчэ́ і бяды́ набярýся!..

ПАЎЛЮК /прачнýўшыся, стóгне/. Ульляна! Ульляна!

ПРОНКА /бытцам раптам перэпужалася, прыседае падаецца ў кут за шафу, - відаць яе толькі публіцы/.

МАРЦЭЛЬКА /хутка выходзіць, стукаючы палкай/.

ПАЎЛЮК /падыймаецца, стогнучы што раз сільней, і клічэ/. Ульляна! /Посьле паўзе, не маючы сілы стаць на ногі, чатыры разы да дзьвярэй, каля дзьвярэй упаў і клічэ яшчэ раз/. Ульляна!..

З'ЯВА 9-ая.

ТЫЕ-Ж і УЛЬЛЯНА -АЎДОЦЬЦЯ - ПІЛІП - ДАНІЛКА.

УЛЬЛЯНА /прыбегшы/. Ісусе Хрысьце! што гэта з ім?.. А казала, што забьецё... Божухна мой міласэрны! /Падыймае яго; нясуць на ложка/.

АЎДОЦЬЦЯ /прыбегшы за Ульлянай/. Я яму ўраз дам станоўніку!.. /Выбегае/.

ПІЛІП /да Ульляны/. А ты гарачаго попелу на жывот палажы яму, толькі хутка!.. Хутчэй! Хутчэй!..

УЛЬЛЯНА /выймае попел с печы, сыпле у хвартух, завязывае і нясе Паўлюку, каторы стогне/.

АЎДОЦЬЦЯ /прыносіць зельле у гаршчку/. Ось станоўнік - ад усіх хвароб памагае!.. /Падыйшоўшы да Паўлюка, стаўляе гаршчок і, прычытываючы, кажэ/. У Імя Айца і Сына!.. Яму-ж грамніца, а не станоўнік патрэбен!.. Ён-жэ, бедненькі, зусім канчаецца...гля-

дзіце!.. і вочы ўжо́ бяльмо́м завала́ківае!..

УЛЬЛЯНА /пла́чучы/. Мі́ленькі мой!.. Ба́ценька мой ро́дненькі!.. /Бяжы́ць па грамні́цу/.

ДАНІЛКА /смо́ргаючы но́сам/. А каб яе́ пакруці́ло. Ле́зла, шэ́льма, чэпля́лася, як смала́!.. Здурне́ў зусі́м і прапа́ў!.. /Прычыта́ючы/.

ПІЛІП. Садо́ма і Ґамора! ба́чыш?.. гэ́та ты зрабі́ў, ты, нячы́сьцік пракля́ты!

УЛЬЛЯНА /прыно́сіць запа́леную грамні́цу/.

ПІЛІП. Ба́цьковая!.. да́йце, ма́тка!.. трыма́йце - праз сьлёзы нічо́га не ба́чу...

АЎДОЦЬЦЯ /устаўля́ючы грамні́цу Паўлюку́ у руку́/. Прэсьвята́я Дзе́ва, атпусьці́ грэхі́ нешчасьлі́ваму!.. Прымі́ яго́ ду́шу!.. /Усе́ на кале́нах ей патура́юць; у гэ́ты мо́мэнт з'яўля́ецца Марцэ́лька; падпаўза́е да Пілі́па і ця́гне яго́ за рука́ў; ён, уста́ўшы, ідзе́ за е́ю. Паўлю́к сто́гне, выпуска́е з рук грамні́цу і седа́е на ло́жку. Усе́ ўстаю́ць, перапу́джэныя/.

АЎДОЦЬЦЯ. Прэсьвята́я дзе́ва. Дай яму пажы́ць хоць яшчэ мiну́тку!.. Як-жэ табе, Паўлючо́к?..

ПАЎЛЮК. Лепш, кума́, лепш, а грамні́цу загасі́це:- не прыйшоў яшчэ́ час на яе́.

УЛЬЛЯНА /цалу́ючы яго́/. Бог Ўсемаґу́шчы!..

АЎДОЦЬЦЯ. Бу́дзеш жыць!.. цяпе́ рака напі́йся кума́нёк!.. /Дае́ яму́ зе́лак/.

МАРЦЭЛЬКА /Пілі́пу/. Пілі́п! ве́даеш, Пілі́п? Ве́даеш што?.. Твой дзе́вер атру́чэны.

ПІЛІП. Ня мо́жэ быць!..

МАРЦЭЛЬКА. Далібо́г!.. Не кажы́ то́лькі, мой мі́ленькі, што гэ́та я табе́ каза́ла. Атру́ты яна́ у стра́ву яму́ насы́пала - сама́ мне гэ́та каза́ла. То́лькі не кажы́, што гэ́та я табе́... калі́ Бо́га баішся...

ПІЛІП /асалаве́ўшы, глядзіць па хаці і затрымываецца на Паўлюку́/. Атру́чэны...

ПРОНКА /сядзі́ць, ско́рчыўшыся, падпіра́ючы бараду́ рука́мі і глядзі́ць на Паўлюка́, вытарашчы́ўшы вочы/.

ПІЛІП /падыйшоў да Паўлюка́/. Ведаеш, Паулю́к?.. ты атру́чэны! жо́нка табе́ задала́ атру́ты - чу́еш?..

ПАЎЛЮК /бы́тцам на пружы́ні падня́ты сяда́е, выпрасто́ываецца, разгледа́ецца у ва ўсе́ бакі́ і ба́чыць на зямлі́ папе́рку ад атру́ты/. Га!..

ПІЛІП. Атру́ціла - усы́пала атру́ты у стра́ву.

УЛЬЛЯНА і АЎДОЦЬЦЯ /лама́ючы ру́кі/. Ці ты е́ў што сяго́ньня?

ПАЎЛЮК /уве́сь час асалаве́ўшы, ціха, не адрыва́ючы вачэ́й ад папе́ркі/. Еў!

УЛЬЛЯНА. А што ты еў?

ПАЎЛЮК /пака́зваючы рукой/. Крупе́ню...

УЛЬЛЯНА /хапаючы гаршчок/. Гэ́та, гэ́та!.. Божэ Міласе́рны. Гля́ньце, ма́тка, не́шта бяле́йша, як заў-

се́ды бывае...

ПАЎЛЮК /мо́ўчкі сядзі́ць/.

ПІЛІП /Дані́лцы/. Падбяжы́ хутчэ́й па вура́дніка - ён на вёсцы. Бог яго́ нам пасла́ў сяго́ньня...

УЛЬЛЯНА. Бяжы́ жыва!.. Гэ́тую шэльму у вастро́г... /Падыйма́ецца го́ман і ґвалт/.

АЎДОЦЬЦЯ. Ой, до́ля-ж на́ша, до́ля!.. Вось!.. сасва́тала табе́ до́ля!.. /Усе́ выбега́юць/.

ПРОНКА /ско́рчыўшыся, угледа́ецца у адзін пункт/.

ПАЎЛЮК /паба́чыу яе і, крыху́ пачэка́ўшы, клі́чэ/. Пронка!

З ' Я В А 10-ая.

ПРОНКА - ПАЎЛЮК.

ПРОНКА /падае́цца ўпе́рад і затры́мваецца/.

ПАЎЛЮК. Про́нка. гэ́та пра́ўда?.. Про́нка! ты ніко́лі не лга́ла, скажы́ і цяпе́рака справедліва,ці гэта пра́ўда?..

ПРО́НКА /пачэка́ўшы, глуха/. Пра́ўда.

ПАЎЛЮК /ця́жка уздыхну́ўшы,па́дае́ на паду́шку/ А?..

З ' Я В А 11-ая.

ПАЎЛЮК - ПРОНКА - ПІЛІП - АЎДОЦЬЦЯ - УЛЬЛЯНА - ВУРАДНІК - ДАНІЛКА.

/Праз мо́мэнт ухо́дзяць усе́: спершá Пілі́п, за

ім Аўдо́цьця і Ульля́на, пачэка́ўшы крыху́ Вура́днік, а за ім Дані́лка. Про́нка стаі́ць сяро́д ха́ты, як стоўп, уста́віўшыся у вадзін пункт/.

ПІЛІП. Ня гне́вайся, дзе́вер, ўраз прыйдзе Вура́днік і забярэ́ гэ́ную шэльму!.. /Плюе́ць; кабе́ты абхо́дзяць Про́нку круго́м здалеку/.

ВУРАДНІК /увайшоўшы, Про́нцы/. А! а! гэта ты... Ну, адзевайся - по́йдзем пагуля́ць... Ну і пагуля́емо мы сабе́. /Піліпі/. Да ста́ну ўжо́ сяго́ньня по́зна - заўтра завязу́, а сяго́ньня у мяне́ пераначу́е...

КАБЕТЫ. То́лькі яе́ адсю́ль забярыце, - змілуйцеся, іраз-жэ і забяры́це...

ВУРАДНІК /ту́заючы Про́нку/. Шэвялі́ся!.. шэвяліся!.. чуеш?..

АЎДОЦЬЦЯ /збіра́ючыся ісьці́/. Прэсьвята́я Дзе́ва. Змілу́йся на́д нешча́сьлівым! вярні́ я́му жыцьцё... Як жэ табе, Паўлючок.

ПАЎЛЮК /гле́дзячы на Про́нку, каторую ўжо́ у дзьвяро́х Вура́днік і Даніл́ка трымаюць за плечы/. Добра... ужо́ до́бра!.. лепш!..

ВУРА́ДНІК. До́хта́ра прышлю́ с прысу́цтва, а цяпе́рака пайшлі́. Німа́ часу́. Остава́йцеся з Бо́гам! /Усе́ іду́ць за ім, папіха́ючы Про́нку прад сабо́й/.

УЛЬЛЯНА. Цыпрука́ во́зьмемо, паку́ль Паўлюк ня вы́здарауляе, а та́мака... во́ля яго.

ПАЎЛЮК /пасьля́ па́ўзы/. Аста́ўце яе!.. /Ульля́на абара́чываецца да Паўлюка́, а ён устае́ пама́лу, бы́тцам наду́мываючы не́шта; калі́ Про́нка ужо́ за паро́гам, ху́тка бяжы́ць памі́ж баб, ідучы́ сва́ду, - яны́ здзіва́ныя падаю́цца наза́д, у глыбь ха́ты. Паўлю́к выбега́е за дзьве́ры, като́рыя астаўля́е адчы́нены... за дзьвяры́ма чу́тно вось што/.

## З ' Я В А 12-ая.

ВУРАДНІК - ПІЛІП - ПАЎЛЮК - ДАНІЛКА.

ВУРАДНІК. Ніяко́га то́лку ту́така німа́. Атру́ціла,- вам яшчэ́ ма́ла... А можэт радней аб'ясьніце...

ПІЛІП. Паўлю́к! Паўлю́к! Бог с табо́й!.. ты чы́ста звар'я́цеў!..

ДАНІЛКА /прычыта́ючы/. Прыстава́ла, спако́ю не дава́ла. Я праз яе́ ду́шу чо́рту запрада́ў... Не бараніце, дзядзька!

ПАЎЛЮК. Гэ́та мая́ во́ля - я прысяга́ў... я сам палі́цыя!.. /Павыша́ючы голас/. Пуска́йце яе́!..

ВУРАДНІК. Го́рды!.. А!.. скаці́на! /Аддаля́ючыся гоман/.

УЛЬЛЯНА і АЎДОЦЬЦЯ /глядзя́ць перапу́джэныя і шэпчуцца/. Звар'я́цеу!.. Зусі́м звар'я́цеў!.. /Даю́ць даро́гу Паўлюку́, като́ры уво́дзіць Про́нку у ха́ту/.

З ' Я В А 13-ая.

ПАЎЛЮК - ПРОНКА.

ПАЎЛЮК /падво́дзіць Про́нку да стала́/. Хадзі! Распрані́ся, - адпачы́неш. Яшчэ́ раз я цябе́ вы́ратаваў, хоць ты і ця́жка саграшыла... але́ каб цябе засадзі́лі у вастро́г, то-бы на ве́кі загі́нула. Мо́жэ хоць цяпе́рака папра́вішся... Пажалеў я цябе́!.. Ой! Як я цябе́ пажале́ў. Я прысяга́ў, што не пакі́ну. /Про́нка стаі́ць адурэўшы/. Ну, чаго-ж ты стаіш? Распалі́ аго́нь, бо ў ха́ці халадно́... і загату́й гарба́ты для сябе́ і для мяне́. Яшчэ́ час на мяне не прыйшоў, дык я і не памёр.. У сярэ́дзіні не́шта дрэ́нна, а́ле нічо́га - про́йдзе. /Сеў на ла́ві, апусьці́ўшы галаву́/.

ПРОНКА /пама́лу, як-бы стано́вячыся на кале́ні, падае ў но́гі Паўлюку́ і, распласта́ўшыся, мо́мэнт ці́ха ляжы́ць, це́ла то́лькі яе ўсё ў су́дарагах, і ці́хі плач ле́дзьве-ле́дзьве далета́е да вушэ́й/.

ПАЎЛЮК /ла́скава/. Ну, до́сі ужо, Пронка! Такая самая ты тутака гаспадыня, як і перш была.../Устаў і ідзе́ у камо́ру/.

ПРОНКА /уста́ўшы, стаі́ць сяро́д ха́ты, по́сьле пама́лу ідзе́ да скры́ні, бярэ́ адту́ль чы́рвоны шнуро́к - та́сьму, падпера́зываецца ею па версі і ідзе да дзьвярэ́й, праз каторые віда́ць галаву́ Марцэ́лькі; Марцэ́ль-

ка, пабачыўшы Пронку, падаецца назад і хаваецца, але Пронка хапае яе ва руку/.

З ' Я В А 14-ая.

МАРЦЭЛЬКА - ПРОНКА.

ПРОНКА. Забіў ён мяне сваёю дабратою!.. жыць на сьвеці не магу з аднаго толькі страху!.. не магу!.. / Уздыхнула і шэпчэ, бытцам сама да сябе/.

МАРЦЭЛЬКА /прысеўшы на парозі, слухае/.

ПРОНКА. Іісусе! Марыя!.. Іісусе! Марыя!.. Каб толькі, здаецца, магла, то забіла-б яе, як суку шалёную...

МАРЦЭЛЬКА /ускочыўшы/. Каго?

ПРОНКА /уставіўшыся у вадну точку/. Стаіць у мяне прад вачыма і стаіць!.. куды-б не павярнулася, усюды яе бачу, а якая страшная!..

МАРЦЭЛЬКА. Хто такі?.. Мая-ж ты міленькая!

ПРОНКА /бытцам толькі цяперака апамятаваушыся/. Я-ж сама...

МАРЦЭЛЬКА. У Імя Айца і Сына і Духа...

ПРОНКА /хапае Марцэльку за плячо/. Глядзі! Глядзі!.. за мною тамака стаіць!..баюся павярнуцца...

МАРЦЭЛЬКА. Хто стаіць?..

ПРОНКА. Ну, я!.. Я яе ўжо ведаю - яна так сама, як пьяніца...калі цьвярозая, дык добра, а калі напь-

ецца, то ізноў яму нешта зробіць!.. /Паказвае на сябе/.

МАРЦЭЛЬКА. Што ты гаворыш, Пронка?.. хто такі?..

ПРОНКА. А я!..

МАРЦЭЛЬКА. Кірэ Алейсон!.. Хрыстэ Алейсон!..

ПРОНКА /хапаючыся за галаву/. Ой! галава мая! галава! /Дрыжыць/. Сьцюдзена! сьцюдзена! /Корчыцца/. Людзі кажуць, што калі хто вешаецца, заўсёды бывае вялікі вецер... і сяготньня якраз тое самое... Чуеш?.. Вые... Чуеш? бач!.. чуе... Будзе мець ахвяру. Вось ляціць за мной, ляціць, гоніцца!.. /Выбегае за дзьверы/.

МАРЦЭЛЬКА /перэжэгналася; бярэ с паліцы хлеб і так сама выходзіць с хаты; вецер завывае; с каморы выходзіць Паўлюк, ледзьве трымаючыся на нагах; апіраючыся аб уселякіе рэчы па дарозі, ідзе да ложка, сперша паўзіраўшыся, дзе Пронка; у гэты самы момэнт чуцен крык Марцэлькі/.

МАРЦЭЛЬКА. Божухна!.. Ратуйце, хто жыў!.. На магілкі!.. Прасьвятая Дзева!..

ПАЎЛЮК /становіцца на ногі, падбегае да дзьвярэй, але ня можэ стаяць на нагах і апіраецца аб сьценку. Гоман павялічываецца. Паўлюк стаіць, астаўпянеўшы, з апушчэнымі рукамі; крык баб/.

## З ' Я В А 15-ая.

### ПІЛІП - ДАНІЛКА - ПАЎЛЮК - ПРОНКА - МАРЦЭЛЬКА - БАБЫ - МУЖЫКІ.

ПІЛІП і ДАНІЛКА /уно́сяць нежыву́ю Про́нку - на шы́і у яе́ шнуро́к, като́ры ця́гнецца па зямлі́; за і́мі ухо́дзяць: ба́бы, мужыкі́, дзе́ці і Марцэ́лька. Паўлю́к стаі́ць бытцам нежывы́, і глядзі́ць/.

ПІЛІП. Паве́сілася! Паве́сілася! На магі́лках... на крыжы павесілася!..

ПАЎЛЮК. Бо́жэ!.. Змі́луйся над яе́ грэ́шнай ду́шэчкай!.. /Паўлю́к па́дае і па́даючы, апіра́ецца а сьценку/.

З а в е с а.

Изъ библіотеки С. К. Живописцева въ г. Орлѣ

К А Н Е Ц.

- - - - - - - - - - - - -

III. Повесьці, апаведаньня прозай.

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Дым Конопницкай | цэна | 4 кап. |
| | Казкі | » | 6 » |
| bis | Гэдалі, Э. Оржэшко | » | 6 » |
| bis | Казка аб вадзе | » | 3 » |
| | Архіп і Лявонка. Горкаго | » | 8 » |

IV. Вершы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Вязанка Я. Лучыны | цэна | 4 кап. |
| bis | Тарас на Парнасе | » | 5 » |
| | Дзед Завала, Ядвігіна Ш. | » | 5 » |
| | Снапок, зборнік вершаў А. Паўловіча | » | 15 » |
| | Адвечная песьня, абразок у XII зьявах Я. Купалы | » | 20 » |
| bis | А хто там ідзе. Песьня Я. Купалы з нотамі | » | 10 » |
| | Biełaruskije pieśni z notami. Sabrań A. Hryniewič | » | 30 » |
| bis | Беларускі песеньнік з нотамі | » | 15 » |
| | Песьни жальбы Якуба Коласа | » | 30 » |
| | Huślar, zbornik wieršań J. Kupały | » | 50 » |
| | Кацярына, С. Шэвчэнка | » | 10 » |
| * | Жалейка. Зборнікъ вершаў Я. Купалы | » | 50 » |
| * | Pan Tadeuš, A. Mickiewiča pierekł. Marcinkiewiča | » | 25 » |
| * | Hapon, apowieść Marcinkiewiča | » | 15 » |
| * | Wiečarnicy, apowieści Marcinkiewiča | » | 15 » |
| * | Šcerańskije dažynki, Kupałła, Marcinkiewiča | » | 20 » |
| * | Dudka biełaruskaja M. Buračka | » | 25 » |
| * | Smyk biełaruski S. Reńki | » | 20 » |

*Увага.* Пачынаючы ад Жалейкі усё выданьне ёсьць і на дарагой паперы у пекнай з беларускім узорам вокладцы. Цена дарагога выданьня два разы даражэй за звычайнае.

Скора выйдуць:

Ab pčołach, Bierozki.
У дому лепей, Новича.
Аб лубине і сэрадэльлі.

**Беларускіе тэатральные творы.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| * | Модны шляхцюк, камэдыя у 1 дзеи Каганца | 25 | кап. |
| * | У зімовы вечэр. Абраз Э. Оржешко у 1 дзеи | 35 | » |
| * | Пашыліся у дурні. Жарцик Крапіўніцкаго у 3 дзеях | 60 | » |
| * | Сватаньне. Жарцик Чехова | 25 | » |
| * | Михалка. Камэдыя у 1 дзеи | 35 | » |
| * | Па рэвізіі, абраз у 1 дзеи Крапіўніцкаго | 35 | » |

«Наша Ніва» за гады:

| | | | |
|---|---|---|---|
| bis | 1906 | 50 | » |
| bis | 1908 | 2 р. — | » |
| bis | 1909 | 2 » 50 | » |
| | Беларускі календар за 1910—1911 г. | 15 | » |

**Беларускіе пачтовые пісулькі.**

Шчарсуны ў летка, Шчарсуны ў зімку, Пранціпэк Богушэвіч (Мацей Бурачок), Вінцук Марцінкевіч, Мужыкі с пад Пухавіч, Торжышчэ у Пухавічах, Дзеўчаты с пад Слуцка, Парабкава дворная хата, Дудар Беларускі, Янка Лучына, Вясковая баба, Дом Тадеуша Косьцюшкі, Беларускае евангеліе XV в., Апостол Скорыны, Беларуская біблія XVII в., Беларускі псалтыр XVII в., Беларускі жыд, Арба валамі на Палесьсі, Палудзен жэнцоў у Палесьсі, Селянін с пад Мінска, Белавежская пушча, Беларускі тып.

## Выданьня у чужых мовах аб Беларусі.

Бѣлорусы. А. Новины, цэна 10 кап.

Страницы из исторіи крѣпостного права въ XVIII и XIX вѣкѣ М. Довнаръ-Запольскаго цэна 20 кап. З гісторыі апошніх ста лет паншчыны у нас.

Czeczot. Pieśni wieśniacze z nad Niemna i Dźwiny (100 biełaruskich pieśniaŭ). Cena 50 kap.

Dumki białoruskie ze wsi Głębokiego w powiecie lidzkim gubernii Wileńskiej w r. 1885 spisane przez Władysława Weryhę. Krakow, 1889.

Podania białoruskie, zebrane przez Władysława Weryhę, poprzedzone wstępem przez Jana Karłowicza. Lwów, 1889.

П. В. Шейнъ. Матеріалы для изученія быта и языка русскаго населенія С.-З. края. Т. I часть I. Бытовая и семейная жизнь бѣлорусса въ обрядахъ и пѣсняхъ. Спб. 1887. 3 руб.

Его же. Т. I часть II. Спб. 1890. 2 руб.

Его же. Томъ II. Сказки, анекдоты, преданія, воспоминанія, пословицы, загадки и проч. Спб. 1893. 3 руб.

Его же. Томъ III. Описаніе жилища, одежды, пищи, занятій; препровожденіе времени и т. д. Спб. 1902.

Верхнее Поднѣпровье и Бѣлоруссія. Съ 11 политипажами, 37 діаграммами, картограммами и схематическими профилями, 1 большой справочной и 10 малыми картами. Изданіе А. Ф. Девріена. Спб. 1905.

(IX том выданьня „Россія“. Полное географическое описаніе нашего отечества. Настольная и дорожная книга для русскихъ людей. Цэна 3 р. 75 кап. У окладцэ 4 руб. и 4 руб. 25 кап.).

Сборникъ малорусскихъ и бѣлорусскихъ народныхъ пѣсенъ Гомельскаго уѣзда. 180 пѣсенъ записаны для голоса Зинаидой Радченко; стр VII+80, цэна 2 р. 50 к.

Словарь бѣлорусскаго нарѣчія Носовича, цэна 3 руб., стр. 2+752.

Программа для собиранія особенностей бѣлорусской рѣчи. Е. Карскаго стр. 50, цѣна 25 кап.

Государственное хозяйство великаго княжества Литовскаго Довнаръ-Запольскаго, стр. 807—CXII. Цэна 4 руб.

Очерки по организаціи Западно-русскаго крестьянства въ XVI в. Довнаръ-Запольскаго стр. 307+VIII+167 приложеній, цэна 3 руб. 50 кап.

В. Дунинъ-Марцинкевичъ и его поэма «Гапонъ». М. Довнаръ-Запольскаго, цэна 20 кап.

В. Дунинъ-Марцинкевичъ и его поэма «Тарасъ на Парнасѣ». М. Довнаръ-Запольскаго, цэна 15 кап.

Западно-русскіе переводы псалтыри въ XV—XVIII в., изслѣдованіе Е. Θ. Карскаго, стр. 444, цэна 3 руб.

Документы Московскаго Архива Министерства Юстиціи (найбольш беларускіе) стр. 570, цэна 3 руб.

100 prykazak, zahadak, prydumak i hawendaŭ dla pažytku Biełaruskaho (Krywickaho) narodu, napisaŭ A. I. Cena 13 kap.

Бѣлорусскія народныя мелодіи. Е. Р. Романова. Беларускія песьні з нотамі, стр. 44, цэна 1 руб.

Послѣднее возсоединеніе уніатов Г. Шавельскаго, стр. 380+84, цэна 3 руб.

Іосафат Жаркій, провинція Базиліанских монастырей. Біографическій очерк И. А. Хлѣбцевича, стр. 94, цэна 40 кап.

Жировицкое братство Дѣвы Маріи, И. А. Хлѣбцевича, стр. 48, цэна 30 кап.

Усе тры апошніе кнігі—матэрыял да гісторыі Уніи на Беларусі.

Е. Θ. Карскій. Бѣлоруссы:

Т. I. Введеніе въ изученіе языка и народной словесности, стр. 10+466, цэна 2 р. 50 к.

» II, часть 1. Языкъ бѣлорусскаго племени. Историческій очеркъ звуковъ бѣлорусскаго нарѣчія, стр. XXIV+579, цэна 3 руб.

часть 2. Историческій очеркъ словообразованія и словоизмѣненія въ бѣлорусскомъ нарѣчіи, стр. XV+407, цэна 2 р. 50 к.

---

Бел. [illegible] 1994 г.

A000000 1954332